Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 22 (436) | Панядзелак, 5 чэрвеня 1939 года | Цана 20 кап.

ЗА ДАЛЕЙШЫ ТВОРЧЫ РОСТ

На працягу 11 дзён — з 18 па 28 мая грамадскасць Менска ўважліва сачыла за спаборніцтвам маладых калгасна-соўгасных тэатраў БССР. Гэта была творчая справаздача тэатраў социялістычнай вёскі, якія знаёмілі з сваімі дасягненнямі працоўных сталіцы БССР.

Мы бачылі класічныя п'есы — «Егор Булычоў» М. Горкага і «Дура для іншых, разумная для сябе» Лопе да-Вега ў Рагачоўскім тэатры, «Не было ні гроша, ды раптам алтын» А. Н. Остроўскага — у Бабруйскім і «Васса Жэлезнова» М. Горкага ў Слуцкім тэатры. Гэты рэпертуар сведчыць аб імкненні калгасна-соўгасных тэатраў да стварэння высокамастацкіх спектакляў, і гэта творчае дзярзанне трэба вітаць, на гэтым рэпертуары акторы ўдасканальваюць свае майстэрства. Ідучы па гэтаму шляху, Бабруйскі і Слуцкі тэатры значна выраслі.

Але ў гэтым добрым пачынанні ёсць ценевыя бакі. Так, напрыклад, Рагачоўскі тэатр узяў п'есы, якія зараз яму не пад сілу. Мастацкі кіраўнік тэатра тав. Лізункоў не ўлічыў магчымасцей свайго калектыва. Ставячы дзве класічныя п'есы, тэатр павінен быў забяспечыць сябе кваліфіцыраванай кансультацыяй, альбо запрасіць вопытнага рэжысёра, які-б паставіў адзін з гэтых спектакляў. Нам здаецца, што карысці было-б больш, чым гэта атрымалася зараз. Правільна зрабіў Слуцкі тэатр, калі ён стаў на шлях запрашэння кваліфіцыраванага рэжысёра на пастаноўку горкаўскага спектакля. Аднак, не гледзячы на рад недахопаў у рабоце калгасна-соўгасных тэатраў, яны ўсё-ж прарабілі значную работу над класічнымі п'есамі.

На фестывалі былі паказаны п'есы совецкай драматургіі — Полацкім тэатрам «Генеральны консул» і «Таня», Бабруйскім — «Прафесар Палежаеў», Слуцкім — «Платон Крэчэт». З гэтага пераліку мы бачым, што нашы калгасныя тэатры дэсюль непатрабавальныя да свайго рэпертуару. У большасці выпадкаў у іх рэпертуар уключаюцца п'есы, далёка не лепшыя па сваёй якасці. У складанні рэпертуарных планаў існуе яшчэ самацёк.

Час ужо калгасным тэатрам сур'ёзна падумаць аб творчай сувязі з беларускімі драматургамі. Толькі ў трох тэатрах — Бабруйскім, Заслаўльскім і Рагачоўскім пастаўлены п'есы беларускіх драматургаў. Рад беларускіх драматургаў ужо напісалі і працуюць цяпер над п'есамі. Ці вядома гэта кіраўнікам калгасна-соўгасных тэатраў? Мусіць, не. А трэба, каб яны пазнаёміліся з гэтымі п'есамі і лепшыя з іх уключылі ў свой рэпертуар.

На афішах калгасна-соўгасных тэатраў мы сустракалі больш за ўсё прозвішчы Данілава, Легоціна і Лізункова. Гэта сведчыць аб тым, што мала яшчэ рэжысёраў працуе ў гэтых калектывах. Неабходна, каб лепшыя рэжысёры дзяржаўных тэатраў БССР часцей выязджалі на асобныя пастаноўкі ў калгасныя тэатры. Трэба смялей вылучаць лепшых актораў на рэжысёрскую работу. Такі вопыт вылучэння праведзен Полацкім і Слуцкім тэатрамі, і яго трэба падтрымаць.

Калгасна-соўгасныя тэатры ўкамплектаваны маладымі кваліфіцыраванымі акторамі і лепшымі ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці. Калектывы іх творча значна выраслі. Але, каб і ў далейшым яны маглі паспяхова працаваць, трэба неадкладна наладзіць вучобу ў калектывах. Гутарка ідзе не аб вузкім школярстве, а аб глыбокім авалоданні акторскім майстэрствам, аб веданні гісторыі тэатра, аб палітычнай падрыхтаванасці. Трэба вучыцца на ўласнай рабоце, на сваіх дасягненнях і недахопах. Трэба, каб творчы агеньчык мастака заўсёды жыў у акторах калгасных тэатраў. Неабходна таксама рыхтаваць адміністрацыйна - кіруючыя кадры і тэхнічных работнікаў тэатраў.

Фестываль калгасна-соўгасных тэатраў прадэманстрыраваў дасягненні маладых калектываў. На фестывалі акторам дапамаглі зразумець дадатныя і адмоўныя якасці іх работы. Рэжысёры, акторы, крытыкі, пісьменнікі падрабязна і глыбока разглядалі кожны спектакль, паказаны на фестывалі. Крытыка была дзелавой і таварыскай, накіраванай на дапамогу тэатрам. Работнікі калгасна-соўгасных тэатраў праслухалі рад лекцый аб акторскім майстэрстве, аб беларускай драматургіі.

Пераможцамі фестываля выйшлі тры тэатры — Заслаўльскі, Бабруйскі і Слуцкі. Зараз гэтыя тэатры будуць змагацца за права паездкі ў Маскву на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. Астатнія тэатры, выкарыстоўваючы вопыт лепшых калгасна-соўгасных тэатраў, павінны працаваць над павышэннем якасці сваёй мастацкай прадукцыі.

Перад калгасна-соўгаснымі тэатрамі стаяць адказныя і баявыя задачы: барацьба за высокаякасныя спектаклі, за арыгінальны рэпертуар, за вырошчванне маладых рэжысёраў, за арганізацыйнае ўмацаванне тэатраў, за максімальнае набліжэнне да калгаснага гледача.

Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы для работы тэатраў, і мы спадзяемся, што калектывы калгасных тэатраў справяцца з задачамі, якія стаяць перад імі.

За далейшыя творчыя поспехі, таварышы акторы, рэжысёры калгасна-соўгасных тэатраў!

ВЫНІКІ ФЕСТЫВАЛЯ

Закончыўся першы ўсебеларускі фестываль калгасна-соўгасных тэатраў. Грамадскасць сталіцы БССР упершыню пазнаёмілася з пачэсным і адказным участкам нашага мастацтва — з калгасна-соўгаснымі тэатрамі.

Тое, што мы ўбачылі на фестывалі, не магло нас не ўзрадаваць. Мы ўбачылі цікавыя спектаклі, таленавітых актораў, удумлівую, старанную работу многіх калектываў.

Тэатры надзвычай выраслі за апошні час. Аб некаторых калгасна-соўгасных тэатрах можна цяпер гаварыць як аб самастойных, творча-прынцыповых тэатрах, якія здольны ўжо вырашаць такія складаныя задачы, як поўнацэнная пастаноўка класікі на сцэне (Слуцкі тэатр — «Васса Жэлезнова», Бабруйскі — «Не было ні гроша, ды раптам алтын»), як работа з драматургамі па стварэнню арыгінальнай п'есы (Заслаўльскі тэатр).

Гэтыя тэатры нясуць калгаснікам, працоўным самых аддаленых мясцовасцей рэспублікі сапраўднае мастацтва, а не сурагат, як гэта бывае з праезджымі гастралёрамі, што трымалі раней манаполію на абслугоўванне раёнаў. Трэба разумець, якую палітычна-выхаваўчую сілу і значэнне маюць гэтыя скромныя па сваіх назвах і выдатныя па сваёй рабоце тэатры!

Патрабаванне высокай якасці ад спектакляў калгасна-соўгаснага тэатра, суровая, але таварыская крытыка — так падыходзіла да ацэнкі работы калгасна-соўгасных тэатраў журы. Думаем, што толькі такі падыход і з'яўляецца правільным, усякія скідкі, кампліменты, выдаваемыя ў аванс, не могуць стымуліраваць тэатры на далейшы рост, усякія такія скідкі ёсць прыхаваная пагардлівасць да гэтых тэатраў. Калгасна-соўгасныя тэатры — сур'ёзныя творчыя калектывы, і трэба да ацэнкі іх работы падыходзіць сур'ёзна, творча. Фестываль прайшоў пад знакам дзелавой крытыкі, і гэта ўжо сведчыць аб сур'ёзнай карысці, якую прынёс фестываль.

Як паказалі сябе на фестывалі асобныя калгасна-соўгасныя тэатры?

Журы прызнала лепшымі спектаклямі фестываля «Партызаны» К. Крапівы ў Заслаўльскім тэатры, «Не было ні гроша, ды раптам алтын» А. Н. Остроўскага ў Бабруйскім тэатры і «Васса Жэлезнова» А. М. Горкага ў Слуцкім тэатры.

Спектакль «Партызаны» вабіць нас прастатой, шчырасцю выканання ролей, сапраўднай народнасцю ўсяго спектакля. Акторы, якія выраслі ў тэатры з самадзейнасці, стварылі ў гэтым спектаклі цікавыя, яркія вобразы. Мы ўбачылі ў выкананні арт. Кунцэвіча сапраўднага партызанскага атамана — Данілу Дрыля, фігуру гераічную і задушэўную. 20-гадовы арт. Шыкавец пераконвае, хвалюе ў ролі дзеда Бадыля. Надзвычайная прастата, арганічнае пачуццё праўды на сцэне вылучаюць выканаўца ролі Батуры арт. Ефрэменка. Здольным акторам таксама паказаў сябе арт. Гвяздзёў, выканавец двух ролей — Шмігельскага і Халімона, і актор Кір'янаў, выканавец ролі Рыгора.

Акторкі тэатра добра выконваюць народныя беларускія песні.

Зніжае гэты ўдалы спектакль рад недахопаў, якія ідуць галоўным чынам ад пастаноўшчыка. Спектакль не арганізаван у рытме, тэмпе, няма нарастання ад малюнка да малюнка, няма патрэбнай чоткасці ў пераломных пунктах спектакля (напрыклад, у VII карціне). Мізансцэны часта непрадуманыя, выпадковыя і невыразныя. Гэта пазбаўляе спектакль патрэбнай яркасці і мэтанакіраванасці. Пачуццё густу пакідае пастаноўшчыка ў VI карціне, дзе Рыгор, іграючы на нервах публікі, бясконца наважваецца звязаць Данілу і не рашаецца. Гонячыся за колькасцю апладысментаў, пастаноўшчык менш клапоціцца аб думцы, закладзенай аўтарам у гэту сцэну. Хістанні Рыгора, мучыцельная барацьба ў ім «двух душ» і перамога душы чэснай, працоўнай над дробна-уласніцкай, свінскай — паказаны малапераканальна. Тэатр арыентыруецца тут на нервы гледачоў, а не на іх розум і сэрца. Між тым гэта сцэна «Партызан» — надзвычайная драматургічная знаходка аўтара. Аўтару ўдалося стварыць такую сітуацыю, дзе ненавязчыва, зусім пераканаўча і жыццёва, і ў той-жа час з абсалютнай, амаль тэзіснай яснасцю, паказана сутнасць барацьбы тых двух душ у селяніну, аб якіх гаварыў Ленін. Рыгор узняў нож, і кінуць яго ўжо немагчыма, — можна ўсадзіць яго альбо ў Данілу альбо ў Капярыну. Настаў момант, калі больш увільваць нельга, трэба стаць на той ці іншы бок барыкады. Глядач павінен апладыраваць унутранай перамозе ў Рыгору працаўніка над дробным уласнікам, а на спектаклі Заслаўльскага тэатра глядач апладыруе таму, што Даніла ўратаваўся ад пагражаўшай яму смяртэльнай небяспекі.

Нож, усаджаны ў спіну Кацярыны пры такім падыходзе да тэксту — нацяжка. У Рыгору — Кір'янаву няма той ярасці перамагання мучыўшых яго хістанняў, якая рабіла-б такі ўчынак глыбока апраўданым. Уся сцэна і трактоўка ролі Рыгора — прыклад таго, што тэатр не ўчытаўся як след у аўтарскі тэкст, не глыбока зразумеў яго.

Заслаўльскі тэатр — адзін з лепшых у рэспубліцы калгасна-соўгасных тэатраў, ён можа з'явіцца ўзорам для іншых калгасна-соўгасных тэатраў у тым, як трэба арганізаваць працу, як пранікаць у самыя аддалёныя пункты рэспублікі, як вырошчваць кадры. Але тэатру неабходна значна павысіць свой культурны ўзровень, сваё прафесіянальнае тэатральнае майстэрства. Недахоп таго і другога асабліва выявіўся на спектаклі «Канец Маскарада» Рудзько і Стэльмаха.

Вобразы, схематычныя ў п'есе, сталі яшчэ больш схематычнымі ў спектаклі. Акторы, якія ў «Партызанах» вабілі шчырасцю і праўдзівасцю выканання, хадзілі ў «Канцы маскарада», як у дрэнным аматарскім спектаклі, — нежывыя, нібы манекены, на якіх уздзеты касцюмы прафесара, лётчыцы, старшыні калгаса і г. д. Атрымаўся спектакль антымастацкі, фальшывы. Пры большай вопытнасці, прафесіянальным майстэрстве тэатра можна было-б на гэтым-жа драматургічным матэрыяле стварыць спектакль значна лепшы.

Спектаклі фестываля. «Партызаны» К. Крапівы ў Заслаўльскім тэатры. Арт. І. І. Кунцэвіч у ролі Данілы Дрыля і арт. І. А. Кір'янаў у ролі Рыгора.

Фота І. Каплінскага.

Калектыву неабходна прайсці курс сістэматычнай акторскай вучобы. Тав. Данілаву трэба папрацаваць над сабою, асвяжыць свой тэатральны багаж. Пры тых багатых магчымасцях, якімі валодае калектыў гэтага тэатра, можна быць упэўненым, што такая вучоба дасць надзвычайныя вынікі.

Спектакль «Не было ні гроша, ды раптам алтын» сведчыць аб наяўнасці здольнага акторскага калектыва ў Бабруйскім калгасна-соўгасным тэатры. Сакавітыя, яркія вобразы п'есы Остроўскага ў большасці знайшлі сабе добрых выканаўцаў.

Беззаганна, ярка, тэмпераментна праводзіць ролю Фецішы Міронаўны арт. Грузд. Арт. Гуняжэнка правільна паказвае адзін з найцікавейшых вобразаў Остроўскага — Крупіцкага. Нехапае толькі актору страснасці, каб стварыць вобраз такой сілы і абагульнення, які напісан Остроўскім. Латоцкая ў ролі Ларысы. Легоцін у ролі Епішкіна — акторскія ўдачы спектакля. Здольны актор Оўштэйн, нажаль, шаржыруе ролю Елесі, ператварае яе ледзь не ў клаунаду. Актору трэба вызваліцца ад наігрыша, скрамней і глыбей падыйсці да вобраза. Ён можа і павінен гэта зрабіць. Недапушчальна шаржыравана, з дрэнным камікаваннем і неразумнымі «ужымкамі» выконвае ролю Тыгрыя Львовіча Люлава арт. Карначык. Сутнасці вобраза ніяк не перадае такое выкананне. Няпоўнакаштоўнымі атрымаліся і астатнія вобразы ў спектаклі.

Пастаноўшчык спектакля тав. Легоцін паказаў сябе як культурны, здольны рэжысёр. Характар п'есы Остроўскага ўлоўлен і перададзен у спектаклі. Аднак, заўважаныя недахопы павінны прымусіць яго пераглядзець гэты спектакль, больш дапрацаваць вобразы спектакля.

Афармленне спектакля, зробленае тав. Аляксеевым, бадай, самае ўдалае ва ўсім фестывалі.

Вельмі слабым аказаўся другі спектакль тэатра — «Прафесар Палежаеў».

Тэатру трэба сур'ёзна, упарта працаваць. За першы год існавання ён шмат чаго дабіўся. У далейшым ён павінен дабіцца яшчэ лепшых вынікаў.

Слуцкі тэатр паказаў культурны, прафесіянальна спелы спектакль «Васса Жэлезнова», які атрымаў добрую ацэнку журы і гледачоў.

Калектыў Слуцкага тэатра, бадай, найбольш вопытны і спелы ў тэатральным сэнсе. Аднак, перад калектывам стаіць небяспека страты непасрэднасці, шчырасці, пакрыцця ціна акторскіх штампаў. Гэта намячалася ў «Вассе Жэлезновай», а асабліва праявілася ў спектаклі «Платон Крэчэт». «Платон Крэчэт» — сантыментальны спектакль. Тэатр іграе меладраматычны і сантыментальны сюжэт п'есы, а не яе сутнасць. Наогул у кіраўніка тэатра тав. Турава заўважаецца схільнасць да сантыментальнасці і да меладраматычных сюжэтаў. Гэта відаць нават на падборы рэпертуару: «Мая маці» Наўрозава, «Платон Крэчэт», «Без віны вінаватыя». Задача тэатра — цвёрда стаць на шляху сапраўднага, глыбока рэалістычнага мастацтва, авалодваць майстэрствам, не падмяняць сапраўдных пачуццяў сантыментамі, а праўдзівасць, характэрнасць вобраза — штампам, наігрышам і вонкавай характэрнасцю. Наогул-жа ад Слуцкага тэатра можна шмат чаго чакаць у будучым.

Здольны акторскі калектыў ёсць і ў Рагачоўскім тэатры. Гэты тэатр — адзін з найбольш устойлівых у адміністрацыйна-гаспадарчым сэнсе. Аднак, мастацкая лінія тэатра няправільная, тэатр ганяецца за гучнымі імёнамі ў сваім рэпертуарным спісе, не клапоцячыся аб якасці спектакляў. Акторы, працуючы над складанейшымі вобразамі, недаступнымі пакульшто для іх, міжволі ідуць па шляху вонкавых эфектаў, наігрышу. Спектаклі здзіўляюць павярхоўнасцю, неахайнасцю. Неабходна рэзка змяніць лінію тэатра, прадумаць жорсткую крытыку, якую тэатр атрымаў на фестывалі. Тады тэатр хутка зможа заняць належнае месца ў сістэме калгасна-соўгасных тэатраў.

Невялікіх яшчэ поспехаў дабіўся Полацкі тэатр. Тэатр валодае здольным калектывам, але ён недастаткова спаяны, а галоўнае — у ім няма кіраўніка, які аб'яднаў-бы і накіраваў энергію калектыва па правільнаму шляху. Новы мастацкі кіраўнік, які прыйдзе ў тэатр, павінен аб'яднаць калектыў і пераключыць яго на сур'ёзную работу, абраць моцны драматургічны матэрыял, на якім акторы змаглі-б расці.

У працэсе першапачатковага станаўлення знаходзіцца Лепельскі тэатр. Ён па сутнасці яшчэ больш нагадвае гурток мастацкай самадзейнасці, чым тэатр. Неабходна ўліць у тэатр ядро прафесіянальных актораў, каб паскорыць рост тэатра.

Многія прынцыповыя пытанні развіцця калгасна-соўгасных тэатраў сталі яснымі ў рэзультаце фестываля. Важнейшыя з гэтых пытанняў — рэпертуарная палітыка тэатраў, вучоба, рэжысура, выхаванне кадраў, крытыка, арганізацыйна-гаспадарчая работа тэатраў. Вывады журы даюць дакладны адказ на гэтыя пытанні. Шлях развіцця калгасна-соўгасных тэатраў цяпер акрэслен больш ясна. Можна з упэўненасцю сказаць, што фестываль адыграў значную ролю ў павышэнні якасці работы тэатраў.

Пасля фестываля калгасныя тэатры павінны няспынна і хутка творча расці. Для гэтага трэба выкананне двух умоў: каб увага, якой былі акружаны калгасна-соўгасныя тэатры ў часе фестываля, не была паслаблена пасля фестываля; каб тэатры ўвесь час атрымлівалі крытыку сваіх спектакляў, канкрэтнае кіраўніцтва іх працай. І другое: каб творчы ўздым работнікаў калгасна-соўгасных тэатраў, які яны перажывалі ў дні падрыхтоўкі да фестываля і ў часе фестываля, не аслабнуў, не перайшоў у заспакоенасць, каб кожны калектыў, кожны член калектыва клапаціўся аб сваім няспынным творчым росце. Тады мы дабёмся сапраўднага росквіту калгасна-соўгасных тэатраў у рэспубліцы і другі фестываль прадэманстрыруе творчыя поспехі, яшчэ больш вялікія, чым тыя значныя і радасныя поспехі, якія прадэманстрыраваў першы ўсебеларускі фестываль.

М. ЮДЗЭЛЕВІЧ.

Спектаклі фестываля: 1. «У пушчах Палесся» Я. Коласа ў Рагачоўскім тэатры. Арт. **М. П. Андрэевіч** у ролі бабкі Насты, арт. **Г. А. Свірчэўскі** ў ролі дзеда Талаша, арт. **А. Ф. Леонава** ў ролі Апанаса і арт. **Н. А. Васілеўскі** ў ролі Букрэя. 2. «Не было ні гроша, ды раптам алтын» А. Н. Остроўскага ў Бабруйскім тэатры. Арт. **Г. Н. Латоцкая** ў ролі Ларысы, арт. **М. Л. Оўштэйн** у ролі Елесі і арт. **А. К. Понкрат** у ролі Мігачовай.

Фота І. Каплінскага.

Дэкада кіргізскага мастацтва ў Маскве. «Стрыжка авец» — карціна кіргізскага мастака-самавучкі **Ф. В. Падханава.**

Фотахроніка ТАСС.

НА ВЫСТАЎЦЫ РУСКАГА ЖЫВАПІСУ

Выстаўка гэта, як і ўсякая перасовачная выстаўка, не вельмі вялікая, але яна ў дастатковай меры знаёміць гледача з гісторыяй развіцця рускага жывапісу за апошнія два стагоддзі. Выстаўка пачынаецца з работ двух выдатных рускіх партрэтыстаў XVIII і пачатку XIX стагоддзя — Ф. Рокатава і Д. Лявіцкага. Адзін і другі мастак прадстаўлены мужчынскімі і жаночымі партрэтамі. Асабліва добрыя работы Рокатава, пачынальніка псіхалагічна-рэалістычнага партрэта ў Расіі.

Вялікую цікавасць уяўляюць работы А. Венецыянава, аднаго з піянераў рускага рэалістычнага мастацтва. На выстаўцы мы бачым дзве яго работы: «Зварот салдата» і «Сялянская дзяўчына».

Работы буйнейшых майстроў рускага акадэмізма прадстаўлены на выстаўцы слаба, але ўяўленне аб акадэмізме даюць работы К. Брюллова, А. Егорава, часткова К. Макоўскага і іншых. Значна паўней прадстаўлены перадвіжнікі, якія адыгралі, як вядома, вялікую рэвалюцыйную ролю ў развіцці ідэйнага рэалізма ў рускім жывапісу. Тут мы бачым «Мужчынскі партрэт» і эцюд «Галава селяніна», выкананыя главой школы перадвіжнікаў І. Крамскім. Вельмі паказальны работы двух выдатных жанравых мастакоў-перадвіжнікаў — В. Макоўскага і В. Перова. Вайстрыню соцыяльных характарыстык, жывапіснае майстэрства В. Макоўскага мы бачым у яго карцінах «Талкучка», «Шавец», «Вясковыя палітыкі» і ў афорце «Наведанне шпіталя». З работ В. Перова выстаўлена вядомая незакончаная яго работа «Прыезд інстытуткі да сляпога бацькі».

З карцін рускіх пейзажыстаў выстаўлены лясныя пейзажы І. Шышкіна, эцюд «Неба з воблакам» Ф. Васільева, «Сосны» А. Куінджы і «Мора» І. Айвазоўскага.

Дастаткова поўна, у сэнсе характарыстыкі творчасці, прадстаўлен Ап. Васнецоў. Тут выстаўлена вядомая яго работа «Старая Масква». Вікт. Васнецоў, вялікі гістарычны жывапісец, аўтар славутых «Багатыроў» і «Івана Грознага», паказан на выстаўцы двума невялікімі, нехарактэрнымі для яго стылю работамі.

Вялікую цікавасць выклікаюць работы вядомага рускага імпрэсіяніста К. Каровіна «Паляўнічы» і «У Крыму».

З работ І. Рэпіна паказваюцца «Жаночы партрэт», эцюд «Вясковы жабрак» і невялікая ілюстрацыя да аповесці Гогаля «Тарас Бульба».

Совецкі жывапіс на выстаўцы прадстаўлен работамі І. Грабара, Пятрова-Водкіна, І. Бродскага, Ф. Багародскага, І. Драздова і іншых.

Перасовачная выстаўка, арганізаваная Ленінградскім рускім музеем, — вельмі прыемная падзея ў мастацкім жыцці Совецкай Беларусі. Выстаўка гэта, як і закрыўшаяся нядаўна выстаўка рускай гравюры, шмат у чым дапаможа беларускім мастакам, якія працуюць зараз над карцінамі для мастацкай выстаўкі 1940 года.

А. ДАЛІН.

СУСТРЭЧА ЧЛЕНАЎ УРАДА БССР З УДЗЕЛЬНІКАМІ ФЕСТЫВАЛЯ

31 мая ў Доме партыйных курсаў адбылася сустрэча членаў урада БССР з удзельнікамі фестываля калгасна-соўгасных тэатраў. На сустрэчы прысутнічалі таксама майстры мастацтваў, пісьменнікі, мастакі, прадстаўнікі друку.

Адкрываючы вечар сустрэчы, старшыня Соўнаркома БССР тав. Кісялёў гаворыць аб дасягненнях калгасна-соўгасных тэатраў, стварэнне якіх стала магчымым толькі дзякуючы Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі і велізарным клопатам партыі, урада і вялікага Сталіна аб развіцці культуры народаў СССР. Імя вялікага настаўніка і друга працоўнага чалавецтва тав. Сталіна выклікае доўгую авацыю ўсёй залы.

Тав. Кісялёў ставіць перад работнікамі калгасна-соўгасных тэатраў рад практычных задач — паляпшэнне творчай работы, рост тэатраў за кошт уцягнення ў іх калектывы найбольш здольных і таленавітых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, арганізацыя марксісцка-ленінскай і творчай вучобы. Тав. Кісялёў звяртаецца да майстроў мастацтваў з заклікам узяць шэфства над калгасна-соўгаснымі тэатрамі, дапамагчы ім узняць сваю творчую работу на большую вышыню.

З прамовамі выступаюць рэжысёр Тэатра оперы і балета т. Тамарын, артыстка Слуцкага тэатра тав. Каменская, мастацкі кіраўнік Заслаўльскага тэатра тав. Данілаў, актор Рагачоўскага тэатра тав. Свірчэўскі, актор Бабруйскага тэатра тав. Оўштэйн. Яны гавораць аб вялікай творчай зарадцы, якую даў фестываль, аб вялікай увазе партыі і ўрада, якую яны адчуваюць у сваёй штодзённай рабоце.

У заключэнні сустрэчы з яркай прамовай выступіў цёпла спатканы сабраўшыміся сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка. Ён спыніўся на значэнні тэатраў у справе выхавання працоўных мас і ўказаў на яшчэ маючую месца недаацэнку іх работы. Тав. Панамарэнка паставіў рад практычных задач работы і вучобы ў калгасна-соўгасных тэатрах, заклікаў актораў і ўсіх работнікаў тэатраў да творчай згуртаванасці, крытыкі і самакрытыкі сваёй работы, каб дабівацца яшчэ лепшых поспехаў.

Тав. Панамарэнка ўказаў, што неабходна рашуча павярнуцца да калгасна-соўгасных тэатраў, забяспечыць паляпшэнне іх творчай і арганізацыйнай работы.

Вечар закончыўся вялікім канцэртам, у якім прынялі ўдзел артысты Тэатра оперы і балета, Тэатра музкамедыі і Дзяржаўнай кансерваторыі.

НОВЫЯ ЧЛЕНЫ ССП БССР

Чарговае пасяджэнне праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР 29 мая было ў асноўным прысвечана прыёму ў члены саюза.

Тав. Кучар рэкамендуе прыняць у саюз маладога крытыка Г. Бярозкіна, які вядом чытачу па яго артыкулах аб творчасці А. Куляшова, П. Броўкі, па тэатральных рэцэнзіях. Тав. Бярозкін таксама многа піша аб творчасці Маякоўскага, прычым, як указаў у сваім выступленні Міхась Лынькоў, піша арыгінальна, не «прэсна», хоць часцяком у яго артыкулах і назіраецца залішняя віцыеватасць стылю. Тав. Груб'ян дае добрую ацэнку артыкулам Бярозкіна аб Феферы, Галкіне і іншых яўрэйскіх совецкіх пісьменніках. Аб рабоце тав. Бярозкіна выказаліся таксама тт. Куляшоў, Якімовіч, Клімковіч.

Тав. Бярозкін аднагалосна прыняты ў члены ССПБ.

Прыняты ў саюз малады драматург, аўтар п'есы «Даёш Волгу» — маёр Барыс Паўлавіч Макарцэў. Характарызуючы творчасць тав. Макарцэва, тт. Якуб Колас, М. Лынькоў, Модэль, Шапіра ўказваюць, што ў асобе гэтага маладога драматурга мы маем своеасаблівага і таленавітага пісьменніка з уласным творчым аблічам.

П'еса «Даёш Волгу» з'яўляецца закончаным літаратурным творам, вылучаецца свежасцю і смеласцю вобразаў. У п'есе дадзен вобраз Лазара Майсеевіча Кагановіча ў перыяд грамадзянскай вайны.

Тав. Якімовіч рэкамендуе прыняць у саюз маладога пісьменніка П. Левановіча, які піша галоўным чынам для дзяцей. Яго апавяданні карыстаюцца поспехам. Тав. Лынькоў гаворыць аб неабходнасці ўдзяліць значна больш увагі пісьменнікам, якія пішуць для дзяцей, і падтрымлівае рэкамендацыю тав. Якімовіча.

Праўленне прыняло тав. Левановіча ў члены саюза.

Прыняты таксама ў саюз аўтар шматлікіх апавяданняў аб Арктыцы ордэнаносец-чэлюскінец А. Міронаў.

Аднагалосна прынята рашэнне аб пераводзе з кандыдатаў у члены саюза тт. Паслядовіча і Груб'яна.

**

На гэтым-жа пасяджэнні праўленне саюза вырашыла стварыць 4 брыгады для азнаямлення працоўнай моладзі з беларускай літаратурай. У перыяд з 10 да 15 чэрвеня брыгады, куды ўвайшло каля 15 празаікаў і паэтаў, разам з прадстаўнікамі ЦК ЛКСМБ выедуць у абласныя і раённыя цэнтры.

Давід Сасунскі

У верасні 1939 года ўсе народы Совецкага Саюза будуць святкаваць 1000-годдзе армянскага эпаса «Давід Сасунскі»,—эпаса, які даўно ўжо набыў сусветную вядомасць і славу. Ён стварыўся ў гераічнай барацьбе армянскага народа супроць арабскіх заваявальнікаў, у барацьбе супроць усемагутнага тады халіфата—за дзяржаўную незалежнасць Арменіі. Сваё ўласнае геройства ў гэтай барацьбе армянскі народ увасобіў у вобразах асілкаў Санасара і Багдасара, Мгера Малодшага і Мгера Старэйшага, а асабліва Давіда Сасунскага,—у вобразах любімых народных багатыроў. Гэтым народны эпас Арменіі пераклікаецца з гераічным багатырскім эпасам рускага народа—з былінамі пра Ілью Мурамца, Мікулу Селянінавіча, Дабрыню Нікіціча, якія таксама ўвасобілі барацьбу Кіеўскай Русі са стэпавымі качэўнікамі. Апісанне галоўных ідалаў багдадскага Халіфа ў «Давідзе Сасунскім» і ідалішча паганага ў рускіх былінах, вобраз Залатой Арды і багдадскага Халіфа, жарты і гульні Васілія Буслаевіча і такія-ж гульні Санасара і Багдасара, апісанне асады гарадоў і знішчэння незлічоных полчышчаў ворага жаночыя вобразы ў былінах і ў армянскім эпасе, а галоўнае—ўслаўленне магутнага свабодалюбівага духу народа і яго непахіснай волі адстояць сваю незалежнасць,—вось што робіць армянскі эпас родным і блізкім усім народам Совецкага Саюза.

Эпас складзен у асноўным чатырохстопным ямбам і белым вершам, але ў радзе месц ямб чаргуецца з анапестам, белы верш перабіваецца рыфмай і чатырохстопны ямб пераходзіць у 6—8—12 стопны. Пры перакладзе эпаса на беларускую мову паэты імкнуліся захаваць гэту структуру верша.

Ніжэй друкуецца 1-шы раздзел «Давіда Сасунскага».

****

Частка першая

БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ БАГДАДСКАГА ХАЛІФА

ПРАЛОГ

Услаўлю памяць я тваю,
Цовінар Ханум.
Услаўлю памяць я тваю,
Родны Санасар.
Услаўлю памяць я тваю,
Родны Багдасар.
Услаўлю памяць я тваю,
Керы Таросік.
Услаўлю памяць я дзядоў
Слухачоў маіх.

1.

Жыў-быў язычнік злы Халіф,
Жыў-быў армянскі цар Гагік.
Халіф Багдадам валадаў,
Верд-Капуцінам — цар армян.
Сівы, стары армянскі цар
Меў шмат багацця, шмат дабра,
Адно — наследніка не меў.
Расла-цвіла ў яго дачка,
Красуня Цовінар Ханум.
У час у той хто сілу меў,
Даніну ў слабых сілай браў.
Халіф багдадскі сілу меў
І на армян пайшоў вайной,
Здабычы шмат у нас узяў,
Палонных шмат ад нас павёў,
Парэзаў люта шмат армян.
Багдадскаму Халіфу стаў
Даніну цар армян плаціць.
Аднойчы люты, злы Халіф
К цару двух зборшчыкаў паслаў,
Ім слова строгае сказаў:
— «Ідзіце вы ў армянскі край,
Збярыце там даніну мне!»
Яны да нас пайшлі, прышлі,
Перад палацамі стаяць.
— «Што за агонь у вакне гарыць?»
Глядзяць — то не агонь гарыць,
Красой дзяўчына зіхаціць.
Во спрэчку з сонцам завядзе:
— «Ты не ўсходзь, бо я ўзыйду!»
Якое дзіва! Цуд які!
Яна прыгожая была,
Бы поўны месяц паміж зор,
Што з-за сямі выходзіць гор.
Як толькі зборшчыкі яе
Угледзелі ў тым вакне,
Прытомнасць страцілі ў той міг,
Упалі вобземлю ў той міг.
Ачухаліся — і дамоў!
Ідуць назад у свой Багдад
К Халіфу млосныя прышлі.
Халіф спытаў: — «Даніну мне
Вы прынеслі адтуль, ці не?»
— «Жыві ты вечна, уладар!
Нашто даніна і дабро?
Мы дзіва ўгледзелі адно.
Мы скарб угледзелі адзін —
Самлелі мы, мы ледзь жывём.
Каб ты, Халіф, угледзеў сам,
Тры месяцы ляжаў-бы там...»
— «Што ўгледзелі»? — спытаў Халіф.
Яны ў адказ: — «Шчаслівым будзь!
Тваіх багаццяў не злічыць.
Шмат золата, шмат серабра
І безліч скарбаў дарагіх
Ты маеш, дарагі Халіф.
Крыжапаклоннік цар армян
Дачушку мае — хараство!
Яна — як сонца, як агонь,
Яна ўсіх скарбаў даражэй.
І мы угледзелі яе. —
Хоць ты не еж, не пі, не спі,
Ды вечна на яе глядзі!»
Халіф аж млее — што рабіць?
К цару паслаў ён пасланцоў:
— «За жонку мне аддай дачку!»
І адказаў армянскі цар:
— «Я — армянін, а ты — араб,
Я слаўлю крыж, ты — ідал свой.
Ці-ж выдам дочку за цябе?
Не выдам дочку за цябе!»
І злы Халіф цару сказаў:
— «Калі па згодзе не дасі.
Я з войскам да цябе прыду
І дочку гвалтам забяру.
Твой люд увесь запаланю,
Твой люд стапчу я, бы траву.
Твой род я знішчу да канца,
Твой стольны горад я спалю,
Твой трон, даспехі паламлю!»
І адказаў армянскі цар:
— «Вайна вайной — дачкі не дам!»

2.

Халіф багдадскі даў загад:
— «Аддасць дачку ён — згода, мір,
А не аддасць — смяротны пір!
Цару на снеданне — дымок,
Цару к сняданню — чорны дым,
А на вячэру — попел дам.
Трубіце ў трубы на вайну!»
Трубілі ў трубы на вайну,
Сабралі рацьс, пайшлі, прышлі.
У армянскі край. Там жах і страх.
— «Паслухай нас, армянскі цар,
Адумайся хоць раз, Гагік:
Альбо дачку сваю аддай,
Альбо сатрэм з зямлі твой край.
З зямлі сатрэм, дабро збярэм,
З сабою ўсё мы забяром!»
Зірнуў наш цар. Што бачыць ён?
Шмат больш чым зорак рацьс прышла.
Як той буран варожы стан —
Злы вораг перамог армян.
На вышыні стаіць Ханум,
Шчыр-думу думае адну:
— «Зашмат бяды, зашмат жуды
Мой бацька на мяне ўзваліў.
Загіне, прападзе народ.
Хоць будзе шмат удоў, сірот —
Мяне ўсёроўна забяруць.
Дык лепш хутчэй самой пайсці.
К Халіфу я сама пайду
І гэтым выратую край!»
Пайшла, прышла к цару ў дзіван: *)
— «Скажы, цар-айча, што рабіць?»
І цар Гагік прамовіў так:
— «І я пытаю: што рабіць?
Вайна вядзецца з-за цябе.
Не пойдзеш, дочка, у Багдад —
Халіф усіх нас забярэ
У палон, а царства ў пыл сатрэ...
Цябе, дачка, яму аддаць?
Дык ён — араб, я — армянін!»

*) Дзіван — месца зборышчаў і суддзілішча.

І Цовінар Ханум ў адказ:
—«Як не пайду к яму адна,
Ён за мяне заб'е усіх.
Я лепш пайду, я лепш пайду,
Зніму з народа ўсю бяду.
Я лепш сама адна памру
За бацьку, за народ, за край.
Мой бацька, ты хутчэй мяне
Халіфу лютаму аддай!»

3.

Склікаў нараду цар армян.
Склікаў нараду ў свой дзіван:
— «Аддаць дачку, ці не аддаць?»
Епіскап Вартпатрык прышоў,
Керы Тарос туды прышоў.
Склікаў цар у дзіван усіх,
Адкрыў нараду і спытаў:
— «Аддаць дачку яму сваю,
Ці даць адпор яму ў баю?»
Адзін сказаў: — «Не ваяваць,
А лепш дачку яму аддаць».
Другі сказаў: — «Лепш ваяваць,
Гатовы мы жыццё аддаць!
Паганцу, нехрысцю ў Багдад
Дзяўчыны нашай неададзім.
Адстоім чэсць, народа чэсць!»
Тарос — яму семнаццаць год —
Прамовіў: — «Мы за чэсць цара
Усе імкнёмся ваяваць.
Хай славіцца, жыве наш цар!
Відаць, што хоча ўвесь наш род
Ханум не даць, а ваяваць.
А мне здаецца, шкоды менш —
Ханум як згіне, чым народ.
Паслухай, цар, хоць раз мяне —
Хай гад дзяўчыну лепш бярэ.
З Халіфам цяжка ваяваць.
Угавары сябе, наш цар.
Што ты не меў дачкі зусім».
Епіскап Вартпатрык за ім
Таксама згоду даў сваю:
— «Аддаць дзяўчыну і — канец!»
Няма ратунку для дачкі.
Згадзіўся бацька, цар армян,
Паслаў к Халіфу пасланцоў:
— «Дачку табе я аддаю!»

4

Набраў Халіф сватоў-братоў,
Прымчаў на пір — вясельны пір.
Царэўна падышла к цару:
— «Скажы Халіфу, бацька мой,
Няхай палац збудуе мне.
Жыць буду ў ім я роўна год,
Хай роўна год ка мне не йдзе.
Служанку-няньку мне дасі,
Паеду я. Пра гэта ўсё
Скажы багдадскаму цару».
Пра гэта ўсё армянскі цар
Сказаў багдадскаму цару:
— «Халіф багдадскі, я з табой
Пачну дружыць вось калі:
Як возьмеш ты дачку маю,
Дык для яе збудуй палац.
Няхай дачка ў ім роўна год
Жыве адна, сама з сабой.
Ты роўна год к ёй не хадзі».
Халіф багдадскі адказаў:
— «Мой любы, згоду я даю,
Прымаю ўмову я тваю.
Ты выдай дочку за мяне —
Даніны больш не трэба мне,
Хачу мець жонкаю Ханум,
Хачу быць зяцем я тваім.
І прысягаю я табе:
Не год адзін — сем поўных год
Я не пайду ў яе пакой.
Служанку-няньку ёй дасі.
Вазьму ў Багдад тваю дачку.
І ля палаца ля свайго
Пастаўлю новы ёй палац».

5

Халіф багдадскі на лугу
У Тэхцісе расстаўляў шатры,
А цар армянскі свой прытул
У Норагесе аздабляў.
Там пахла мёдам шыр лугоў,
Там кветкі дзіўныя раслі
Каля Малочных ля Крыніц.
Вяселле Цовінар Ханум
Спраўлялі сем ці восем дзён,
Гулялі сем ці восем дзён.
Вось маладая к бацьку йдзе:
— «Мой бацька-цар, ты заўтра мне,
На ўцеху, хай дазвол пайсці,
Пайсці ў Гілі на цэлы дзень,
Да тых Малочных да Крыніц.
Падружак дзесяць я вазьму
З сабой у путь. Дзянёк гуляць,
Дзянёк спяваць мы будзем там,
А ў вечары прыду назад».
— «Я дазваляю. — цар сказаў. —
Ідзі ў Гілі, гуляй дзянёк,
А ўвечары прыдзі назад».
І Цовінар Ханум пайшла
Да тых Малочных да Крыніц
З падружкамі гуляць-спяваць,
Да вечара там кветкі рваць.
Дзяўчына бачыць свет, як цуд,
Вакол працуе просты люд:
Хто палівае свой гарод,
А хто зрывае з дрэва плод,
А хто пасе вунь статак свой,
А хто зямлю арэ сахой.
Дзяўчына дзівіцца: «Ай-вай!
Які цудоўны светлы край!»
Ішлі ўгару на вышыню
І селі, елі, пелі там.
І да вячэрняй да зары
Там кветкі рвалі. З той гары
Угледзелі марскую гладзь,
Пайшлі да мора пагуляць.
Прад тым, як ім ісці дамоў,
Падружкам кажа Цовінар:
— «Паслухайце, падружанькі мае!
Вы пагуляйце, паспявайце тут,
Вы патанцуйце, пачакайце тут.
Я піць хачу. Пайду ваду знайду!»
Яна да берага пайшла.
І ля скалы спыніла крок.
Усюды мора, сінь і гладзь...

Прысела з нянькаю ды ў плач.
Стаміла ногі, доўга йшла —
Яна і нянька хочуць піць.
А дзе напіцца? Што рабіць?
Бядуе Цовінар Ханум:
— «Салёная вельмі ў моры вада.
Хоць кроплю салодкай смачнай вады.
Мы выпілі-б жменьку чыстай вады
Усцішылі-б смагу злую тады».
Служанка па ваду пайшла.
Шукала доўга — не знайшла.
Ратунку просіць Цовінар:
— «О, божа, адкрый мне крыніцу тут...
О, божа, ратуй мяне ад пакут...»
І бог сказаў: — «Хай будзе так!»
І паказаўся ў моры знак —
Узняўся камень з глыбіні,
А з каменя цячэ струмень,
Журчыць, блішчыць, як той прамень,
Струмень крынічнае вады.
Ніхто-б у вопратцы не мог
Пайсці, напіцца той вады.
І шоўкі скінула Ханум,
І да крыніцы падышла,
Ды акунула у ваду,
У жыватворчае пітво,
Сваю самлелую далонь.
Ледзь жменьку выпіла адну,
Яшчэ поўжменечкі вады.
Глядзіць — бяда: ўцякла вада.
Ад гэтых жменечак ад двух
Яна зачала. Цовінар
Падружачак сабрала ўсіх
І з грамадой пайшла ў шатры,
Дзе бацька-цар дачку чакаў.

6

Халіфа рацьс пайшла з зарой.
Цар дочку ў золата прыбраў,
Служанку верную ёй даў.
Ханум садзілі на каня,
І пасадзілі, павязлі,
Паймчалі ў далі, прывязлі
У стольны горад той зямлі.
Дзе муж Халіфам — у Багдад.
Халіф быў горд, Халіф быў рад,
Гасцей склікаў, піры спраўляў.
Сем дзён-начэй ён зноў гуляў.
Сем год ён думаў не чапаць
Сваю Ханум. Палац ёй даў —
Няхай у ім жыве сама.
Пітво і ежу прысылаў,
Прасіў Ханум не выхадзіць.
Яна ў палац у свой зайшла,
Яна праз сем святліц прайшла,
І зачыніла сем дзвярэй,
І сем павесіла замкоў,
Каб не пралез няжданы госць.
У цішыні праз ночы-дні
Давай аплакваць маладосць.

7.

Дні мінавалі. Цовінар
Адчула ў чэраве цяжар.
«Ад мора ён... Маўчаць... маўчаць,
Халіфу слова не сказаць».



З ілюстрацый мастака **А. Мамаджаняна** (Ерэван) да юбілейнага армянскага выдання «Давіда Сасунскага».
Фотахроніка ТАСС.

Аднак, Халіф прыкмеціў сам.
Угневаўся: — «Не ад мяне!»
К сабе везіра ён пазваў,
Везіру тайну расказаў:
— «Везір, як быць нам? Што рабіць?..»
Везір сказаў: — «Жыві ўвесь век!
Халіфу жыць — яе забіць!»
— «Хай так!—сказаў Халіф.—Дзе кат?
І кат з'явіўся ўміг прад ім.
— «Ідзі, мой кат, вазьмі свой меч,
І галаву знімі ёй з плеч!»
К Ханум прышоў, сказаў ёй кат,
Што ад Халіфа ёсць загад,
Каб войстры меч, булатны меч
Ёй галаву адцяў ад плеч.
На гэта Цовінар Ханум:
— «А дзе закон? Дзе чэсны суд?
Калі цяжарную заб'еш,
Адным ударам двух заб'еш.
Прасі Халіфа пачакаць,
Пакуль дзіцё я спараджу.
Хачу сама раней зірнуць,
Ці чалавека спараджу,
Ці штось другое спараджу.
Пасля радоў няхай твой меч
Мне галаву адрубіць з плеч.
Я праўду чыстую скажу —
Прышла нявіннаю сюды,
Нявінніцай жыву і тут.
Мая цяжарнасць, як відаць,
Па божай волі ад вады.
Ад пены чыстай ад марской».
К Халіфу кат пайшоў назад:
— «Мілуй цябе гасподзь, Халіф!
Цара армянскага дачка
І жонка бедная твая
Вось так і так сказала мне».

Пачуў везір. Халіфу ён
Шапнуў: «Гаворыць Цовінар
Зусім дарэчы, далібог!
Няхай жыве, пакуль дзіцё
Народзіць. А пасля радоў
Паспеем зняць ёй галаву».
— «Паспее кара і пасля радоў, —
Сказаў Халіф. — Дык беражыце вы,
Каб волас з галавы яе не ўпаў.
Бо Цовінар — мне жонка. Я, Халіф,—
ёй муж.
Прашу, каб вы не лезлі не ў сваё!»
І дзевяць месяцаў прайшло,
І дзевяць лічаных гадзін,
І дзевяць лічаных хвілін.
У той-жа міг яна, Ханум,
Двух спарадзіла хлапчукоў.
Быў першы рослы, а другі —
Куды драбнейшы за яго.
Імёны маці ім дала:
Сын першы звацца Санасар,
Другі сын звацца Багдасар.
Халіфу вестку прынеслі:
«Двайню ты маеш — двух сынкоў.
Калі ў дзяцей рост па гадах —
Твае сыны растуць па днях».
Халіф прышоў, малых глядзеў,
Ад злосці ледзь не ашалеў.
Ён аднавіў стары загад:
— «Хай вернецца туды мой кат.
У сіле мой стары загад!»
І кат вярнуўся к Цовінар.
— «Я зноў прышоў цябе караць».
Далася дзіву Цовінар:
— «Няма ані кроплі праўды ў цара?
А як-жа без маткі дзецям расці?
Яшчэ не чапайце маёй галавы.
Ад дзетак з палаца не ўцяку».
І кат пайшоў. Халіфа ён
Пра гэта сам паведаміў.
Везіра зноў паклікаў Халіф,
І зноў параду папрасіў:
— «Параду мне дайце, дайце хутчэй,
Што трэба рабіць мне з жонкай маёй?»
Везір спакойна адказаў,
Халіфу так і так сказаў:
— «Дадзім ёй шэсць год для гэтых
дзяцей
Хай вырастуць хлопцы, дзеці яе.
Пасля адсячэм уміг галаву.
Ад хлопчыкаў маці не ўцячэ.
Няхай не выходзіць. Дзверы замкнуць.
Трымаць у палацы матку з дзяцьмі!»
Поўгода Цовінар з дзяцьмі
Жыла ў палацы, бы ў турме,
Больш не сцярпела Цовінар
І пасланца к Халіфу шле,
Сказаць Халіфу вось аб чым:
— «Я птушка ў цябе, што дзержыш
мяне
У клетцы? Жыву ў палоне ў цябе?
Чаму-ж у цямніцы дзержыш мяне?
Чаму-ж выходзіць на двор не даеш?
Праз шчылінку мы на сонца глядзім.
Праз шчылінку мы на волю глядзім».
Халіф сказаў, што Цовінар
Гаворыць праўду ў гэты раз.
«Няхай гуляе на двары
Яна з дзяцьмі хоць дзень і ноч».
І адамкнуў ім вартаўнік
Вароты, дзверы, вокны ўсе —
«Гуляйце сабе дзень і ноч!»

8

І дні ішлі, і дні плылі,
А дзеці дзень у дзень раслі.
Па году толькі ім было,
А выгляд мелі — пяць гадоў.
І Санасар і Багдасар
Выходзілі гуляць з дзяцьмі
І калацілі ўсіх дзяцей.
Праз тры вясны, праз тры зімы
Яны так выраслі — аж страх!
І зацікавіўся Халіф.
К сабе двух хлопчыкаў пазваў.
А як ён толькі паглядзеў
Іх недзіцячы буйны рост,
А як іх гутарку пачуў
І недзіцячы розум іх, —
Зусім збянтэжыўся Халіф.
Ён адаслаў іх к Цовінар.
А час кружыў свой карагод —
Ужо хлапчынам па пяць год.
Аднойчы хлопец Санасар
Везіра хлопчыка пабіў,
У садзе з ім як вёў гульню.
Як стукнуў раз па галаве,
Дык галаву таму скрывіў,
Застаўся хлопчык той крывы.
К Халіфу скардзіцца прыбег
Яго збянтэжаны везір:
— «Нам з неба гора і бяда —
Дзяцей калечуць кожны дзень».
Халіф сказаў: «Дык што рабіць?
Як падрастуць — нам будзе горш,
Мне вырвуць з мясам бараду.
Дай памазгуем, мой везір,
Як збавіцца ад іх, благіх».

9

Тым часам хлапчукі раслі.
Аднойчы раніцай яны
З дзяцьмі гулялі на двары.
Іх акружыла шмат дзяцей,
Дражнілі брыдкім словам — «бідж»*).
І Санасар і Багдасар
Заплакалі, пайшлі дамоў
Да маці, да Цовінар.
— «Скажы, хто бацька наш? Скажы!
Не скажаш — кінемся у вір!»
Ханум іх туліць да грудзей.
— «Ваш бацька? Бацька ваш—Халіф!»
— «Няпраўда, маці! Калі-б так,
Нас не дражнілі-б словам «бідж».
І маці ім пасля таго
Не дазваляла выхадзіць.
Аднак яны праз колькі дзён
Зноў выйшлі ў горад пагуляць.
І пачалася сварка зноў —
Гурма дзяцей падняла крык:
— «Чаго прыходзіце да нас?

*) Бідж — байструк.

Ідзіце прэч! Вы бідж! Вы бідж!».
Бягом пусціліся дамоў
Да маткі Цовінар Ханум,
На грудзі кідаюцца к ёй
І плачуць бедныя наўзрыд,
А з імі маці слёзы лле.
Цалуе іх, мілуе іх:
— «Сынкі мае... Сынкі мае...
Скажу усё заўтра — сёння спаць!
Як пойдзем раніцай гуляць,
Тады скажу, хто бацька ваш».
Паспалі. Маці раніцой
Служанцы мовіла: — «Вазьмі
Харчы для нас, бо пойдзем мы
З дзяцьмі да рэчкі пагуляць,
Развеем вечную журбу».
Пайшлі. Напомніў Санасар:
— «Пра бацьку, матанька, скажы,
Бо кінуся ў глыбокі вір».
А Цовінар Ханум яму:
—«Сынок, не маеш бацькі ты...»
І запытаўся Санасар:
— «Матуля родная мая,
Ці я з-пад каменя прышоў?
Ці нарадзіўся ад куста?
Ці-ж бацька мой не чалавек?».
А Цовінар Ханум яму:
— «Мой сынку... Я аднойчы йшла
З служанкай гэтаю маёй
Ля мора сіняга гуляць.
Хацела піць. Служанцы я
Сказала: — Піць хачу! Вады! —
Аж раптам... цуд... нязнаны цуд...
Крыніца з мора пацякла,
Крыніца смачнае вады.
Я напілася той вады
Перш — жменю поўную адну,
Поўжменькі выпіла пасля.
Вас ад вады мне даў гасподзь,
Ад цэлай жмені — ты, сынок,
Ад палавінкі — Багдасар».
Сказаў на гэта Санасар:
— «Урэшце ведаем свой род.
Цяпер скажы, хто родам ты?».
І Цовінар сказала: — «Я
Дачка армянскага цара».
І так да вечара яны
Гулялі па лугах, палях.
Упрыцемкі ў палац прышлі,
Пасля вячэры спацьляглі.

Пераклаў З. БЯДУЛЯ.

10.

Шмат дзён мінула з той пары...
Глядзяць і дзівяцца сыны,
Што маці часта слёзы лле.
«Скажы нам, маці, што з табой?—
Сыны спыталіся ў яе. —
Ты вянеш, сохнеш дзень за днём.
Мы знаем, маці, што сам бог
Табе дзяцей падараваў,
Халіфа жонка ты — ні ў чым
Няма нястачы у цябе.
Скажы-ж ты нам, якой бядой
Засмучан твар, матуля, твой?»
І кажа маці у слязах:
«О, дзеці, як не плакаць мне:
Не сёння — заўтра мне і вам
Халіф галовы адсячэ».
Сказаў тут маці Санасар:
«Дык вось аб чым бядуеш ты!
Паглядзім, як ён адсячэ».
Калі мінула шэсць гадоў,
Паклікаў катаў злы Халіф,
Сказаў: «Ідзіце адсякаць
Галовы жонцы і сынам».
І Санасар і Багдасар
Заняты ў гэты час гульнёй,
А маці плача за сцяной.
Заходзяць каты да яе
І кажуць ёй: «Парінны мы
Галовы сёння вам знімаць».
Сказала маці ім: «Няўжо-ж
Рука падымецца у вас
Галовы хлопчыкам знімаць?»
— Сказаць па-праўдзе, — кажа
кат,—
Нам цяжка руку падымаць,
Галовы з хлопчыкаў знімаць,
Ды што-ж рабіць — такі загад
Халіфа, — рад ты ці не рад,
«Цішэй, — іх просіць Цовінар, —
Каб не пачулі хоць сыны,
Не напужаліся-б яны.
Прысядзьце, дайце пагуляць,
Пабегаць шчэ хоць трошкі ім».
«Нам не дазволена сядзець, —
Сказаў ёй кат. — хутчэй на двор
Хадзем: не тут-жа адсякаць.
Нашто крывёю заліваць
Пакой. Хутчэй!» — зароў той кат.
Пачуў крык катаў Санасар.
Ён дзверы адчыніў, глядзіць:
Там людзі з шаблямі стаяць.
«Што вам тут трэба?» — запытаў.
Ледзь чутна маці просіць іх:
«Вы не кажыце хоць сынам,
Чаго прышлі... О, гора мне!
Лепш завядзіце іх на двор,
Пастаўце катаў з двух бакоў,
Няхай адразу, спадцішка,
Сатнуць галовы ім яны,
Каб не спалохалі дзяцей...
Прытым спачатку галаву
Сячыце мне, пасля — сынам».
Згадзіўся кат: «Ну, што-ж, хадзем».
«Куды?» — спытаўся Санасар.
Сказала ласкава Ханум:
«Ды на хвілінку вось на двор».
«Тут маці нешта ёсць. Скажы!»
Адказу маці не дала.
І Санасар яе стрымаў:
«Ты штось хаваеш ад мяне...»
Уздыхнула маці: «Мой сынок,
Не буду праўды я таіць:
Халіф паслаў мне галаву
Адсекчы...» Ускрыкнуў Санасар:
«Хто гэта мусіць адсякаць?»
«Вось гэты чалавек, сынок».
Да ката хлопчык падышоў
І крыкнуў грозна: «Адсякаць
Ты мусіш маці галаву?»

«Ды так Халіф нам загадаў —
Галовы вам адсекчы ўсім».
Тут размахнуўся Санасар
І аплявуху кату даў.
Прэч адляцела галава
І толькі тулава стаіць.
Другія каты уцяклі.
Прышлі і скардзяцца цару:
«Даў кату аплявуху сын.
Прэч адляцела галава
І толькі тулава стаіць».
Тады Халіф збірае рацьс
І на сыноў з вайною шле.
Браты убачылі — на іх
Ваякі бацькавы ідуць.
Насустрач выйшлі ім браты
І перабілі дапямна
Палову бацькавых ваяк.
Астатніх страх апанаваў
І ўсе разбегліся яны.
Назаўтра ў бой супроць сыноў
Цар палкаводца шле свайго.
«Не можам, — кажа той, — на іх
Ісці мы ў бой, яны ўдальцы,
Асілкі; царства ўсё тваё
Яны разбураць, падзішах.
Нам лепей крыўду, цар, забыць,
Чым войска дарма загубіць».
Стаў думу думаць падзішах,
Нарэшце кажа: «Зразумеў,
Нам небяспечна ваяваць.
Яны — асілкі. І цяпер
Мне ясна стала, што Ханум
Была нявіннай прада мной, —
Яна мне — жонка, а яны —
Вядома, ёсць мае сыны».

11.

Сабраўшы войска, раз Халіф
На Апастан вайной пайшоў.
Прышоў і горад Капуцін
З усіх бакоў ён асадзіў.
На пашу выгнаць не маглі
Жывёлу з горада. Даўно
У зямлю не падала зярно.
І хлеб такім стаў дарагім,
Што за чырвонец залаты
Тут булкі хлеба не купіць.
Няма ні хлеба, ні вады,
Канае з голаду народ.
Па хатах людзі ўсе сядзяць,
І ўсё гавораць аб адным:
«Ці вернецца, о божа, час,
Каб зноў уволю мець яды,
Каб есці, колькі хочаш ты?»
Між іх быў добры чалавек,
Сказаў ён: «Заўтра ў гэты час
Пшаніцы будзе шмат у нас».
Між іх благі быў чалавек,
Што зваўся Кро, — ён адказаў:
«На жменю золата табе,
Дай толькі хлеба за яго.
Я накармлю сваіх дзяцей.
Дзе-ж, дзе возьмеш хлеба ты?
Каб нават давялося мне
Самому бачыць, есці хлеб —
Усё-ж не паверу я табе!»
І Кро праклянуў той чалавек.
«На бога спадзяюся я, —
Сказаў, — калі-ж не верыш ты,
Што заўтра будзе танны хлеб,
Каб хлеб ты ўбачыў, ды не еў».

12.

Гагік сабраў тут юнакоў,
Пастроіў з іх сабе палкі.
Яшчэ да ранішняй зары
Іх рыхтаваць да бою стаў:
«Як толькі я вам знак падам,
Тады вы кідайцеся ў бой».
Калі уночы цішыня
Настала, крыкнуў цар: «У бой!»
І дружна ўдарылі палкі.
Халіфа першыя рады
Назад бягуць; на іх свае
Напалі заднія рады.
Керы-Тарос і юнакі
З мечамі, шаблямі бягуць
І крышаць ворагаў, сякуць.
Пайшла між ворагаў разня
Такая, што байцы сваіх
Не пазнавалі — як чужых
Адзін другога білі тут.
Ракою кроў лілася іх.
Халіфу вестку прынеслі:
Няма ўжо войска у яго.
Ён сам пайшоў і ўбачыў ён:
Байцы яго сваіх-жа б'юць
І за пара бліжэй бягуць.
Разбіў Халіфа наш народ.
Застаўся цар адзін адным.
Ён на вярблюда з Шама сеў,
Сеў і дамоў хутчэй уцёк.
Усталі раніцай, глядзяць:
Байцы Халіфа ў рад ляжаць.
Тады пайшлі і чалавека прывялі
Нявернага і мерщчыкам паставілі яго,
Каб рэшту хлеба і яды ён людзям
раздаваў,
Каб долю роўную для кожнага адмераў ён.
Благі няверны чалавек абмераў аднаго.
І тут усе, схапіўшы мерку ў чалавека
з рук,
Ударылі той меркаю яго па галаве.
Няверны чалавек адразу-ж і сканаў.
І сапраўды: убачыў хлеб ён ды не
еў.

13.

Як уцякаў дамоў Халіф,
Маліў ён ідалаў сваіх:
«О, памажыце мне ў бядзе.
О дзе вы, ідалы, о дзе?
Я за ратунак дацць гатоў
Вам сорак маладых кароў».
(Ці-ж можа ідал памагчы?)
Тады ён зноў маліць пачаў:
«Ратуйце, ідалы, цара,
Я дам вам многа серабра,
Я дам вам золата мяшок»
(Ніводзін ідал не прышоў.
Ці-ж можа ідал памагчы?)
Тады Халіф завыў ізноў:
«О, мой галоўны ідал, ты,
Калі на помач мне сюды
Прыбудзеш, калі жыў-здароў
Вярнуся я к сабе дамоў,
Дык у афяру двух сыноў
Прынесці я табе гатоў!
І духі чорныя прышлі
І пад вярблюжым жыватом
Яны Халіфа панеслі.

14.

У гэту ноч Ханум сніць сон,
Што быццам у яе руках

(Працяг на 3 стар.).

Давід Сасунскі

(ПРАЦЯГ)

Гарэць дзве свечкі, і яны
То гаснуць, то ізноў гараць.
Ханум прачнулася, ўстае.
Дзяцей сваіх яна заве,
З бакоў абапал ставіць іх,
Цалуе, плачучы, малых.
Сыны спыталі: «Што з табой,
Чаго ты, маці, слёзы ллеш?»
І расказала маці сон:
«Сасніла я, што трапіўшы ў бяду, Халіф
Вас ідалу ў афяру абяцаў.
Як прыдзе, вас ён у афяру прынясе.
Падумайце хутчэй, як ратавацца вам,
Бяжыце, дзеці, да армян у Апастан.
Уночы зоркі вам пакажуць шлях.
Вам раніцай пакажа шлях зара».
Усталі хлопчыкі, з сабой
Узялі шаблі, стрэлы, лук.
Ялу сабе яны бяруць
І ў стайню царскую ідуць.
«Эй, конюх, — кажуць, — двух каней
Ты вывядзі для нас хутчэй».
Каней ім тут-жа падвялі.
Паселі хлопцы, і назад
Да маткі едуць, грудзі ёй
Цалуюць, кажуць: «Ну, цяпер
Хай прыдзе, зловіць нас Халіф».
І, памаліўшыся, браты
Паехалі, і да святла
Былі далёка ўжо яны.

З ілюстрацый мастака **А. Мамаджаняна** (Ерэван) да юбілейнага армянскага выдання «Давіда Сасунскага».
Фотахроніка ТАСС.

15.

Заззяла сонца над зямлёй;
Ханум устала, і на двор
Выходзіць, бачыць там яна:
На шамскім на вярблюдзе цар
Дамоў спяшаецца адзін,
Без палкаводца, без байцоў.
Чарней смалы Халіфаў твар.
З сядла саскочыў і хутчэй
Бяжыць з трывогай да дзвярэй.
Халіфу кажа Цовінар:
«Вось як! Хай будзе цар здароў,
Няхай табе паможа бог!
Сем год пра храбрасць, цар, тваю
Пра славу чуткі йдуць вакол.
Дык што-ж цяпер было з табой?
Дзе войска дзелася тваё?
Дзе палкаводзец верны твой?»
І адказаў Халіф тут ёй:
«Прыцісnуў я дужа гяураў тых,
Запёршы іх моцна ў сценах сваіх.
Ужо быў апошні іх час прышоў.
Але на світанні вогненны град
Пасыпаўся зверху, войска маё
І палкаводца — усіх перабіў.
І вогненны меч на войска напаў,
Сячы байцы сталі адзін адны.
І я ледзь не трапіў у гэтую сеч,
Ды сеў на вярблюда, дамоў уцёк.
Я ідалам шмат афяраў суліў,
Я ім серабро, золата ім суліў, —
Яны не прышлі ратаваць мяне.
Я старшаму ідалу паабяцаў
Санасара даць, Багдасара даць —
Тады і прышлі ратаваць мяне».
Падумала так Цовінар сабе:
«О, божа! дзяцей бязвінных маіх
Ён хоча узяць і іх закалоць...»

16.

Мінула колькі дзён, начэй.
Агнепаклоннік той Халіф
Аднойчы ў капішча пайшоў.
Тут люты вораг — д'ябал сам —
Залез у ідалаў нутро,
Афяраў дамагацца стаў.
І старшы ідал закрычаў:
«Дзе Санасар, дзе Багдасар?
Нясі ты мне ў афяру іх,
І пажаданні ўсе твае
Тады я выканаю ўміг».
Галоўны жрэц цару сказаў:
«Афяру ідал захацеў».
«Усё вазьмі, — сказаў Халіф, —
Што хочуць, ідалам аддай».
«Ёсць два сыны, цар, у цябе.
Іх маці паважае крыж.
Вось іх і просіць ён у нас, —
Другіх афяр не хоча знаць».
Сказаў Халіф: «Праз дзесяць дзён
На пагулянку да крыніц
Мы ідалаў сваіх вядзём.
Туды вазьму я і сыноў,
І прынясу ў афяру іх».
Халіф да жонкі падышоў
І кажа: «Царская дачка,
Ты знаеш, што хачу сказаць?»
«Ну, што?» — спытала Цовінар.
«Жадаюць ідалы афяр».
«Хай не разбурыцца твой дом.
Хіба ў цябе няма цяліц,
Хіба ў цябе няма авец?
Бяры, ў афяру ім аддай».
Халіф сказаў: «Не, не, людскіх
Жадаюць ідалы афяр».
«Ці мала ў горадзе тваім
Бяздомных знойдзецца дзяцей.
Ты у афяру іх прынось».
Падбяцаў прынесці ім: павінен я тваіх
Іх у афяру ідалам маім аддаць,
Што збавілі ад смерці і пакут мяне».
Халіф сказаў: «Не, жонка, я дзяцей
Сказала царская дачка:
«Хай не разбурыцца твой дом!
Мае сыны — твае сыны.
Як хочаш, так сабе рабі.
Бяры, ў афяру прынясі».
«Дзе-ж Санасар, дзе Багдасар?
Мы — тут, а дзеці нашы дзе?»

Пераклаў **А. ЯКІМОВІЧ.**

17.

А з той начы, як Санасар
І Багдасар у дальні пуць
На конях рушылі, прайшло
Чацвёра сутак. Нават ноч
Іх не спыняла на спачын.
На пяты дзень чужой зямлі
Яны дасяглі рубяжоў.
І перад імі шлях залёг
Ушчэллем вузкім паміж гор
З ракой вялікай. Ёй на сустрач
З гары высокай бег ручай.
Яго струмень ваду ракі,
Як шабляю, перасякаў
І след срабрысты пакідаў
Надоўга між чужой вады.
І, стаўшы, дзівяцца браты:
«Якую-ж сілу мае ён
Каб напал рэчку падзяліць
І процілеглы бераг мыць?»
Падумаў думку Санасар
І брату думку перадаў:
«Мяне дзівіць, брат, моцна дзівіць, брат,
Як малы ручай, што з гары цячэ
Напалам раку, як нажом, сячэ
І малы струмень у яе вадзе
Не зліваючы доўга сам вядзе.
Што за вада, брат Багдасар?
І брату брат адказ дае:
«Знаць, гэта — волатаў вада,
І хто пап'е з яе крыніц,
Той будзе волатам, сагнуць
Яго не здолеюць к зямлі».
І слова мовіў Санасар:
«Хто адшукае, дзе з крыніц
Бярэ пачатак той ручай,
І над магутнаю вадой
Збудуе дом, — той чалавек
Асілка сына будзе мець
І род праславіць з века ў век».
І даў тут клятву Санасар:
«Афяра богу — хлеб з вадой!
З табой мы пойдзем на гару
І над вадой жывою той
Збудуем дом, наследны дом.
З вадою сіла б'е з крыніц,
Ёсць сіла ў нас, няхай вада
Сваю нам сілу перадасць».
«Хай будзе так», — прамовіў брат.
І перайшлі яны раку,
Узялі пуць па ручайку,
Уздоўж грымучае вады.
І дзень і ноч на грэбень гор
Няспынна ехалі браты,
І на вяршыну узышлі.
Глухое месца там было:
Ушчэллі, скалы, ў гушчары
Брадзілі вольныя звяры, —
Відаць, ніколі чалавек
На гэты камень не ступаў.
Знайшлі крыніцу паміж скал,
Яе сярэбраны струмень
Збягаў уніз аж да ракі.
І спадабалася братам
Мясціна. Кажа Санасар:
«Кругом такая любата.
Што век, здаецца, тут-бы жыў».
Браты прыселі ля вады
І парашылі збудаваць
Сабе тут крэпасць і палац.
Брат старшы меншаму сказаў:
«Ідзі шукай дзічыну ты,
А я каменне пакладу,
Граніцу вызначу сяла».
Сем дзён работа так ішла:
Хадзіў на ловы Багдасар,
А Санасар каменне клаў.
Мяжу абводзіў. Час настаў
Падмурак крэпасці рабіць.
На ўсход пакрочыў Санасар,
Пайшоў на захад Багдасар,
І кожны камень з іх прынёс,
Які падняць ён толькі мог.
Каменні склалі цэлы груд,
Падалі рукі і сцяну
З малітвай сталі будаваць
Там, дзе іх першы быў прывал.
Пакуль адзін сцяну складаў,
Другі браў стрэлы, пругкі лук,
Ішоў на ловы, каб змяніць,
Прышоўшы, брата на сцяне.
Ішла работа дзесяць дзён,
Ішла работа дванаццаць дзён,
І дзень і ноч, і дзень і ноч.
Прышоў аднойчы Санасар
І бачыць: стомлены заснуў
За працай цяжкай Багдасар.
Дзічына бітая, ў крыві,
Ляжала проста на зямлі,
А Багдасар, як мёртвы, спаў.
І Санасар загараваў:
«Устань, братуля, прэч адсюль
Мы пойдзем: так не можна жыць,
Без солі есці і рабіць.
Каб воля божая была,
Палац Халіфа мелі-б мы.
І запытаў у брата брат:
«А што-ж рабіць нам, Санасар?»
— «У свет мы пойдзем, Багдасар».
Браты, асядлаўшы коней, у Меш
Прыехалі, там быў царом Мушэг.
Прышлі, цалавалі зямлю сем раз,
І сталі, схіліўшыся, перад ім
З рукамі накрыж. Цар спытаў:
«Патрэбу маеце вы у чым?
Чаго вы просіце ад нас?»
Браты з паклонам у адказ:
«Няма патрэбы ані ў чым.
Адна надзея — ў небе бог,
А на зямлі ты — светлы цар,
Адно жаданне — прытулі
Пад свой пакроў нас, добры цар,
Адслужым праўдай, — бачыць бог».
Спытаў Мушэг: «Хто-ж бацька ваш?»
— «Халіф багдадскі, добры цар».
Спужаўся цар: «З маёй зямлі
Хутчэй ідзіце, каб Халіф,
Зямель магутных уладар,
На нас не рушыўся вайной
І вас і нас не паланіў.
Прытулку, вам мы не дадзім».
І зноў паехалі браты
З трывожнай думай: дзе-ж прыстаць?
К начы прыехалі ў Арзрум.
Прышлі к эміру два браты,
З паклонам сталі перад ім,
Як два магутныя дубы.
Залюбаваўся Аміран,
Эмір Арзрума, на братоў,
Аб родзе-племені спытаў:
«Адкуль прышлі, чые сыны?»
«Халіф багдадскі — бацька наш».
Аж войкнуў з жаху Аміран:
«Як-жа пазбыць мне з карку іх?
Баімся мёртвых іх, а тут
Спаткаць даводзіцца жывых.
Не, прытуліць не можам вас,
Туды ідзіце, дзе былі».
І выйшлі зноў браты, пайшлі
З цяжкою думаю. Сказаў
Да Багдасара Санасар:
«Паслухай, брат, на што імя
Халіфа, ворага свайго,
Мы начапілі на сябе?
Пакуль мы будзем называць
Сабакі гэтага імя, —
Ніхто прытулку нам не дасць.
Давай, калі спытаюць нас,
Мы скажам: бацькі ў нас няма,
Няма ні маці, ні радні,
Ні бацькаўшчыны, ні зямлі,
Тады прытуляць нас хутчэй».
Так згаварыўшыся, пайшлі
Яны у крэпасць Маназрэт,
Царыў там цар Тавадарос,
Прышлі і сталі ля варот.
Спыталі слугі, падышлі:
«Вы што за людзі?»
— «Да цара
Прышлі на службу», — быў адказ.
Цару сказалі. Кліча ён
К сабе братоў. Яны ўвайшлі,
Пацалавалі сем разоў
Зямлю, на восьмым рукі ў крыж
З паклонам склалі. Толькі іх,
Бялявых, стройных маладых,
Пабачыў цар, — упадабаў,
І, усміхнуўшыся, спытаў:
«Што трэба, дзеці мае, вам,
Чаго прышлі?» Браты ў адказ:
«Надзея наша — ў небе бог,
А на зямлі — ты, уладар.
Нас прытулі, абарані,
Бацькоўскім вокам глянь на нас.
А мы адслужым клопат твой».
І запытаў цар: «Вы-ж адкуль,
З якой зямлі, з якіх краёў».
«Таго не знаем, добры цар».
— «А хто ў вас ёсць,—бацькі, браты?»
— «Няма нікога, уладар.
Кутка бацькоўскага няма.
Раслі сіротамі ў чужых
Ад самых малых лет сваіх».
І запытаў ізноў іх цар:
«З якой патрэбай к нам прышлі?»
«Служыць табе, вялікі цар».
Цар спадабаў іх, загадаў:
«Даць у палацы ім пакой,
Пасцель паслаць і накарміць».
І слугі споўнілі загад,
Змясцілі хлопцаў у пакой,
Давалі ежу і віно.
Так, з ласкі царскай, зажылі
Браты. Стаў стольнікам адзін
І віначэрпіем другі.
Цару служылі роўна год
Браты шчасліва, без журбот.
Праз год везір сказаў цару:
«Правер, я раю, уладар
Умельства слуг тваіх — братоў».
— «Разумна раіш», — цар сказаў.
У свой дзіван братоў пазваў,
І царскі ім дае загад:
«Вы баявой ігрой цара
Пацешце заўтра раніцой».
Браты пайшлі у свой пакой,
Паначавалі, а чуць свет —
Даспехі бранныя свае
Браты надзелі і з двара
На конях едуць, каб цара
Пацешыць баявой ігрой.
Прыехаў цар, і войска з ім,
На плац шырокі, на майдан,
Сказаў цар: «Слухай, Санасар,
Бяры ты воінаў маіх
І стань на той бок, я-ж, везір
І Багдасар — насупраць вас».
А Санасар: «Не гэтак, цар!»
«А як?»—спытаў Тавадарос.
—«А так. Я з братам стану тут
А ты, везір, і раць твая
Насупроць нас няхай ідзе».
І цар сказаў: «Хай будзе так».
І сталі біцца. Не прайшло
Яшчэ гадзіны,—бачыць цар,
Што войска быццам не было,
Адны пабітыя ляжаць.
Сказаў: «Везір, хай знішчыць бог
Твой дом, як радаю сваёю
Ты знішчыў мой... Дагэтуль нас
Лічыў адважнымі народ,
Аж бабы мы супроць мужчын».
Сказаў, схіліўшыся, везір:
«Гані іх, цар, з дзяржавы прэч!»
А ў гэты дзень рабаўнікі
Забралі царскі статак. Цар
Аж трыццаць коннікаў сказаў
Паслаць за імі наўздагон.
А з коннікамі — двух братоў.
Тут Санасар сказаў цару:
«Не трэба коннікаў нам, цар,
Удвух мы статак адаб'ём».
Узялі зброю і удвух
На конях рушылі ўздагон.
Здагналі, збілі; нібы скот,
Пагналі разам са скатом
Рабаўнікоў назад к цару.
Рабаўнікоў цар павязаў,
Братоў яшчэ лепш стаў трымаць
І дагдядаць, і шанаваць.
Аднойчы рана набрылі
Браты на моладзь, на гульню
У бой шчытоў, бо з-за шчытоў
Кіямі біліся яны.
Браты сказалі тут: «Давай
І мы далучымся да іх».
Пайшлі, ударылі... Бяда!—
Каго ударыць, то й заб'юць.
Пабеглі слугі да цара:
«Зірні, што робяць». Цар пазваў
Братоў і стаў іх дакараць:
«Што нарабілі вы, на што
Падобен злы учынак ваш?»
Сказалі: «Цар, жыві сто год!
Так абярнулася гульня».
Сказаў цар: «Вы-ж багатыры,
Хто-ж вытрымае ваш удар?
Каб болей гэтак не было».
— «Не будзем больш»,—браты ў адказ.
Было вяселле ў гэты час
У царскім горадзе. Каней
Сядлала моладзь і віхром
На скачкі ехала. Паслаў
На скачкі тыя цар братоў:
«Сядлайце коні, малайцы,
Гуляйце з моладдзю і вы».
Браты паехалі. У гульні
Радня і госці маладых
Пасталі конна супроць іх.
Ніхто не мог братоў здагнаць
Ці меткай паліцай дастаць.
Пасля-ж браты, у свой чарод,
За імі гналіся. Калі,
Пыл падымаючы з зямлі,
За імі гнаўся старшы брат,
Ці багатырскаю рукой
Кідаў ім паліцу ўздагон, —
Ён сэрца цешыў у гульні,
А шкоды ім не прычыняў.
Калі-ж малодшы здаганяў,
Ён у запале біў і мяў.
І двух ці трох пашкодзіў ён.
Убачыў гэта Санасар,
Не спадабаў, спыніў гульню
І з братам рушыў ён дамоў.
Плады паклаўшы на паднос,
Ён брату меншаму сказаў,
Каб той цару плады занёс,
Бо знаў, што трапяць у бяду,
Як пакалечаных радня
Са скаргай прыдзе да цара.
Так і было. Радня прышла
Са скаргай: «Цар наш, прагані
Асілкаў з горада, пакуль
Не натварылі большых бед».
У гэты час плады прынёс
Ім Багдасар — і за ядой
Яны забылі на дзяцей,
Што пакалечаны ў гульні.

18.

Аднойчы прыяцель братоў
Прышоў, сказаў: «У гневе цар
Даў згоду вас адсюль прагнаць»,
І кажа брату Санасар:
«Прытулку не заслужыш тут.
Ідзём і свой збудуем кут.
Мы столькі сіл паклалі там,
А наша крэпасць на гары
Недабудаванай стаіць.
І Багдасар сказаў: «Ідзём».
А заўтра рана раіць ён:
«Не будзем хлеб пячы цару,
Не панясём яму віна,
Не пойдзем самі да цара».
Прачнуўся цар,—братоў няма.
На гэты раз паклікаў іх.
Прышлі і сталі перад ім.
«Чым прагнявілі мы цара». —
Спыталі:—«што ты ганіш нас?»
Цар адказаў: «У гнеўны час
Такое слова я сказаў.
А слова царскае—закон.
Ідзіце вы к сабе ў пакой,
Разважце, дзе-б хацелі жыць,
Пасля прыходзьце,—дам дазвол
Ісці, сяліцца дзе люба».
— «Во, добра, — думаюць браты, —
Туды мы пойдзем, дзе стаіць
Недабудованы наш дом».
І з гэтай думкай па зары
Яны ізноў к цару прышлі.
Спытаўся цар: «Які-ж вы край.
Абралі, дзеці, для сябе?»
Сказалі: «Цар, жыві сто год.
На запытанне, як прышлі,
Праўдзівы далі мы адказ:
Няма радні, бацькоў у нас,
Адно сталі мы ў той час, —
Што-ж знае бог, то знай і ты, —
Прыклалі мы намнога сіл
Тут над будоўляю адной,
Але, не скончыўшы, пайшлі».
І расказалі, як было,
Як да крыніц па ручаю
Яны дайшлі і уласны дом
Распачыналі будаваць.
«Дазволь закончыць нам яго».
«Вось бачыце, — ім цар сказаў.
А я-ж вас калісь запытаў:
Ці ёсць у вас свой дом, бацькі?
Вы адказалі: «Не, няма,
Няма нідзе нічога ў нас»...
Ну што-ж, ідзіце ў добры час.
Каб скончыць крэпасць, скончыць дом.
І просяць зноў браты цара:
«Жыві ты доўгі век, наш цар.
Адно хацелі-б мы прасіць:
Адным нам цяжка будзе жыць
У тым кутку зусім глухім.
Ты дай нам некалькі дамоў
І багачоў і беднякоў,
Хай пабудуюцца яны
У новым горадзе, было-б
Па вечарах куды схадзіць,
Паразважаць, пагаварыць».
І сэрцам злітаваўся цар.
Даў сорак ім сямей-дамоў.
Ну і дамы! Ну і двары!
На цэлы двор — адзін асёл
З прылад — адно верацяно.
І вось на стромкую гару
З перасяленцамі пайшлі.
К сваёй крыніцы Санасар
І Багдасар ішлі, прышлі.
Спытаў у брата Санасар:
«З чаго-ж мы будзем пачынаць:
Ці будзем крэпасць будаваць,
Ці нашай бедната дачы?»
Брат адказаў: «Давай раней
Збудуем кожнаму з іх дом.
Каб сонца спёкай не пякло
Галовы бедныя людзей».
І пачалі з дамоў. За дзень
Зрыў катлаван на дзесяць хат
Адзін магутны Санасар.
А Багдасар к ім лес цягаў.
І будавалі удваіх.
Так за чатыры дні браты
Сорак дамоў пад самы дах
Пабудавалі, потым з гор
Бярвення з сучча, як было,
Панацягалі — сорак стрэх.
І размясцілі па дамах
Перасяленцаў. Талака
Была-б нічога, каб не рот,
Бо за работай елі так,
Што пасля іх любы бядняк
Не меў чым мышы пакарміць.
Калі-ж абжыў дамы народ —
Прышоў і крэпасці чарод.
Браты каменне нанаслі,
Што нават тысячы валоў,
Здаецца-б, звезці не маглі.
А потым майстра прывялі.
Каменне майстар паглядзеў.
Сказаў: «Падняць не ў сілах я».
І Санасар ізноў пайшоў,
Другога майстра ён прывёў.
Другі таксама паглядзеў.
Спытаўся: «Што? Во з гэтых скал
Павінен сцены я складаць?
Я-ж пававрнуць іх не змагу».
«А хто-б то змог?»—так Санасар
Спытаўся. Майстар адказаў:
«Не знаю гэтакіх людзей».
І Санасар тады сказаў:
«Нацягні ты шнур, месца падрыхтуй,
Як класці скажы, я сам пакладу».
Майстар паказаў — ён каменне клаў:
Слуп каменны клаў на каменны слуп,
На скалу—скалу, на гару —гару.

З ілюстрацый мастака **А. Мамаджаняна** (Ерэван) да юбілейнага армянскага выдання «Давіда Сасунскага».
Фотахроніка ТАСС.

Аж пакуль сцяна абышла кругом,
Тады далі ўпор сцяне і скончылі на тым.
А ў працы неўзаметку цэлы год сыйшоў.
Так новы год ім крэпасць новую прынёс
І засталося толькі ёй імя надаць.
Яны-ж не знаюць, як назваць.
Сказаў да брата Санасар:
«Ну, як назваць нам новы дом,
Які так добра склалі мы?»
А брат ў адказ: «Мяркуй ты сам:
Будаваць — гэта справа час тваіх,
А назваць — гэта справа твая».
Хто не прыходзіў да братоў,
Браты пыталі: «Як назваць
Нам нашу крэпасць, наш дом».
Але ніхто не мог сказаць.
І колькі не было людзей,
Ніхто імя ім даць не мог.
А хто й даваў — дык неўпапад.
Аднойчы вечарам браты
Трымалі раду. Багдасар
Сказаў: «Ідзі ты, Санасар,
Знайдзі старога старыка
І запрасі да нас на чэсць,
Стары напэўна імя дасць».
Ледзь золак неба асвяціў,
Пайшоў у поле Санасар.
Хадзіў ён доўга, аж пакуль
Старога дзеда не знайшоў.
Высока дзед на схіле гор
Араў сахою цаліну.
А хлопчык коні падганяў.
Пабачыў Санасара дзед,
Пакінуў працу, паглядзеў.
А Санасар к яму ідзе.
Схапіў старога за руку.
«Ідзі хутчэй, дзядуля, к нам».
А дзед яму: «Пакінь мяне
У спакоі». — «Ты не бойся, дзед,
У нас ты толькі пагасці,
Я прывязу цябе назад».
Падумаў дзед і згоду даў.
Падняў дзядулю Санасар
К сабе ў сядло, прывёз дамоў,
І накарміў, і напаіў,
Да цёмнай ночы частаваў,
І напаследак запытаў:
«Ці знаеш ты, чаго прывёз
У крэпасць гэтую цябе?»
А дзед: «Твой розум малады!
Адкуль мне ведаць, адкуль знаць,
Чаго ты зваў мяне сюды?»
— «Дзядуля, — Санасар сказаў, —
Багат ты розумам і стар.
Хадзіў ты многа на зямлі.
Мы збудавалі гэты дом,
Імя-ж яму не нараклі.
Не знаем самі, як назваць.
Цябе прывёў сюды, дзядок,
Как крэпасць нашу ты назваў.
Імя прыгожае ёй даў,
Парай, як крэпасць нам назваць»,
Стары сказаў: «Хай будзе так».
Кругом агледзеўся, сказаў:
«Хай я памру за вас, браты,
Якое-ж імя лепей даць?»
Браты ў адказ: «Як знаеш сам».
Стары падумаў і сказаў:
«Спямнела зараз, раніцой
Мы гэта вырашым, сынкі».
Заснулі, ўсталі раніцой,
З малітвай снедалі, пасля
На ганак выйшлі ўсёй сям'ёй.
Стары патупаў па двару,
Усюды кінуў пільны зрок,
Благое й добрае глядзеў,
І, абярнуўшыся, сказаў:
«Не бачу, дзеткі, я ўсяго,
Каб дом ваш іменем назваць».
«Дзядуля,—Санасар сказаў, —
Я на спіну цябе вазьму
І крэпасць нашу абнясу,
А ты глядзі — і дай імя».
Згадзіўся дзед. Сеў на спіну.
Аб'ехаў крэпасць, паглядзеў
З усіх бакоў, убачыў ён,
Што горы згрудзілі браты
У сцены крэпасці сваёй.
А аглядаў ён цэлы дзень:
Як выйшаў з захаду з варот,
Дык толькі к вечару дайшоў,
Дайшоў, прышоў да тых варот.
І тут чакаў яго народ,
Бо згаварыліся былі:
«Як толькі з'явіцца стары,
Насустрач выйдзем мы яму:
Якое слова скажа ён,
Спаткаўшы нас, — мы словам тым
Названне крэпасці дадзім».
І дзед прышоў. Яны к яму:
«Што скажаш, дзед?». Стаў ля варот,
Акінуў вокам верх і ніз,
Каменні ўбачыў, што на верх
Паклалі людзі, — а было
Камення тысячы пудоў, —
Здзівіўся дзед, сказаў, спытаў.
«Няхай завецца гэты дом...
Хай бог святы спрыяе вам.
Якое імя яму дам?
Хай бог дабра ўсім вам пашле.
Якая-ж сіла ў вас была,
Што скалы цэлыя ўзняла
Сасунскія на верх варот?
Было ім цяжка на зямлі
Ляжаць, а вы іх паднялі
Надзець змаглі Карэ сан сун —
Каменны слуп —на слуп другі.
Не дом, не крэпасць, а сасун —
А ярасць збудавалі вы.
Якую ярасць бачу я.
У вашай крэпасці... Сасун!».
«Даволі»,—мовіў Санасар.
Не трэба болей слоў, імён.
Вось гэта лепшае імя
Для нашай крэпасці: «Сасун».
Ты камень ярасным назваў.
Сказаў, што слуп на слуп надзеў.
Няхай «Карэ сан сун», «Сасун»,
Хай ярасць будзе ёй імя.
А дом наш ярасным завуць
Няхай усе — сасунскі дом».
І крэпасць з тых часоў завуць — Сасун.
А дом завуць — сасунскі дом.
На гэтым скончылі. Сказаў
Тады старому Санасар:
«Дзядуля, заставайся тут,
Як бацьку прытулю цябе».
Стары адмовіўся: «Калі
Ты любіш бога, завязі
Мяне назад у родны край
І дома мне памерці дай».
І Санасар завёў яго
У родны дом, у родны край.

Пераклаў **М. КЛІМКОВІЧ.**

БІБЛІЯТЭКІ-ПЕРАСОЎКІ Ў КАЛГАСАХ

Бабруйская гарадская бібліятэка імя Леніна арганізавала бібліятэкі-перасоўкі ў 30 калгасах раёна. Кожная бібліятэка-перасоўка мае ўсе брашуры з дакладамі кіраўнікоў партыі і ўрада на XVIII з'ездзе ВКП(б), а таксама апошнія выданні мастацкай, палітычнай і сельска-гаспадарчай літаратуры.

Калгаснікі засталіся вельмі задаволенымі работай бібліятэк-перасовак.

Работнікі бібліятэкі ўзялі абавязацельства давесці колькасць бібліятэк-перасовак да 60.

Г. КОЖЫЧ, В. ПАГОДЗІН.

КАНЦЭРТ ВЫДАТНІКАЎ МУЗШКОЛ БССР

24 мая ў менскім Палацы піонераў упершыню ў БССР адбыўся арганізаваны музычным сектарам Упраўлення па справах мастацтваў канцэрт выдатнікаў вучобы музычных школ БССР, прысвечаны вынікам навучальнага года. На канцэрт з'ехалася да 50 удзельнікаў, сярод іх юныя піяністы, скрыпачы, віяланчэлісты, трубачы.

Найбольшым поспехам на канцэрце карысталіся вучні Менскай музычнай школы (дырэктар тав. Герман) — браты Салодчанка, Ната Фаміна, Ліда Бяссмертная, Абраша Будані́цкі, Сёма Рэгенбоген, Грэта Рубіна і інш.

Добрае ўражанне ад пастаноўкі работы і выхавання дзяцей пакінула Бабруйская музычная школа (дырэктар тав. Халамінская). Юны скрыпач Лёва Гарэлік, віяланчэліст Сёма Коган і іншыя паказалі вялікія музычныя здольнасці.

Выпуск Віцебскага мастацкага вучылішча

Віцебскае мастацкае вучылішча выпусціла новы атрад мастакоў у колькасці 42 чалавек. 23 выпускнікі накіраваны педагогамі рысавання ў сельскія школы, 7 чалавек—мастакамі-афармiцелямі ў калгасна-саўгасныя тэатры, 2 чалавекі—метадыстамі выяўленчага мастацтва ў абласныя Дамы народнай творчасці, 2 чалавекі — малодшымі навуковымі работнікамі ў карцінную галерэю БССР, 3 чалавекі—на работу ў Белдзяржвыдавецтва.

5 найбольш здольных студэнтаў накіраваны ў Акадэмію Мастацтваў для далейшай вучобы.

НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ПРАЙШОЎ ПАСПЯХОВА

Каля 400 таленавітых савецкіх рэбят навучаюцца ў Віцебскай музычнай школе. Праверачныя іспыты паказалі, што навучальны год прайшоў паспяхова. З 370 вучняў 106 атрымалі адзнаку «выдатна» і 121 — «добра». Выдатнікі вучобы Будоўніч, Клейн, Гандэльман, Феліцыянт і іншыя атрымалі пахвальныя граматы.

Свае дасягненні выдатнікі вучобы дэманстыравалі справаздачным канцэртам па радыё. Вучнямі былі выкананы класічныя творы Шумана, Грыга і іншых кампазітараў.

Гр. МАКСІМАЎ.

Віцебск.

Спектаклі фестываля. «Генконсул» бр. Тур і Шэйніна ў Полацкім тэатры. Арт. **К. М. Сумейка** ў ролі Жукава і арт. **В. А. Азаркоў** у ролі Гаглідзе.

Фота І. Каплінскага.

АКТОРЫ КАЛГАСНЫХ ТЭАТРАЎ

Фестываль калгасна-соўгасных тэатраў прадэманстрыраваў працоўным сталіцы галерэю адароных актораў. Нажаль, мне не прышлося бачыць усіх удзельнікаў фестываля, але і з бачанага можна зрабіць значныя вынікі.

Фестываль адкрыў Рагачоўскі калгасна-соўгасны тэатр. Гэта — тэатр з вялікім складам упаўне сфарміраваўшыхся актораў.

Б. С. Савіч — добры, рознахарактарны актор. Яго мы бачылі ў трох ролях: Цяціна ў «Егору Булычову», Каміла ў «Дуры для іншых, разумнай для сябе» і ксяндза ў п'есе «У пушчах Палесся». Б. Савіч лёгка, без асаблівых намаганняў «улазіць у скуру» зусім супрацьлеглых вобразаў. Хацелася-б толькі бачыць яго не гэтак інтэлектуальным, з большай страснасцю. Але ўсё-ж добрая і заўсёды тактычная манера падачы вобраза ставіць Савіча ў рад сапраўды каштоўных, з добрай перспектывай, актораў.

Г. А. Свірчэўскі—мяккі, просты, шчыры актор. Хацелася-б, каб цеплыня, уласцівая Г. Свірчэўскаму, часам пераходзіла ў большую моц і страснасць. Свірчэўскі залішне роўны, без нечаканасцей, што перашкаджае яму быць па-сапраўднаму маштабным акторам.

Цікавы актор А. А. Блажэвіч. Яго доктар у «Егору Булычову» стаіць на высокім узроўні. Але ў той-жа п'есе роля Макраусава сыграна ім вельмі няроўна, без пачуцця меры. Узята яркая характэрнасць, але ў вялікім абвайстрэнні, што вельмі зніжае каштоўнасць выканання. А прыкра! Хацелася-б, каб А. Блажэвіч, захоўваючы яркасць, не губляў у выкананні строгасці і пачуцця меры.

Актор Б. А. Талпега — характэрны актор. Дарвідошку ў спектаклі «У Пушчах Палесся» Б. Талпега іграе ярка, цікава. Але чамусьці ў ролях Башкіна ў «Егору Булычову» і Лізено ў «Дуры для іншых, разумнай для сябе» Талпега захоплен больш вонкавымі рысункамі, пераігрывае. На выкананні гэтых ролей ляжыць пячатка надуманасці.

Абаяльны актор Е. П. Гаробчанка. Вельмі добра, што Е. Гаробчанка не звязвае сябе рамкамі пэўнага амплуа, а іграе ролі рознастайна. Але яму нехапае патрэбнай эканоміі выразіцельных сродкаў. Ён не беражлівы ў жэсце і эксперыменце.

Пераканальны Н. А. Васілеўскі ў ролі Паўліна ў «Егору Булычову». Верыш і яго камандзіру ў «У пушчах Палесся». Але незразумела, чаму Н. Васілеўскі баязлівы і залішне скаваны ў ролі Александро ў «Дуры для іншых, разумнай для сябе». Васілеўскаму нехапае тэмпераменту, смеласці і вынаходлівасці.

Добрае ўражанне зрабіў на мяне актор Бабруйскага калгасна-соўгаснага тэатра Я. Н. Кімберг. Гэта — абаяльны, разумны, з вялікім пачуццём меры актор, які добра валодае тэхнікай падпарадкавання сабе гледача.

Н. Г. Суворава, актрыса Полацкага калгасна-соўгаснага тэатра, якая добра іграла ў былым Рэалістычным тэатры ролю манашкі ў «Арыстакратах», зрабіла, на маю думку, памылку, узяўшы ролю Тані. Н. Суворавай, яе абаянню неўласцівы такі тып ролей. Ды і матэрыял ролі Тані патрабуе карэннага перагляду і змен. Фальшывасць становішча, надуманасць у сюжэце «Тані» перамагчы амаль немагчыма.

Т. Зорына — растучая актрыса, якая патрабуе да сябе асаблівай увагі з боку рэжысуры. Вельмі шкада, што Т. Зорына з такой цяжкасцю адмаўляецца ад уласцівай ёй манеры какетнічання. Зорына імкнецца «давыразіць» ролю ўсімі магчымымі вонкавымі сродкамі. Гэтага рабіць не трэба.

Шмат чаго можна было-б сказаць і аб іншых удзельніках фестываля. Бясспрэчна адно: за апошнія два годы калгасна-соўгасныя тэатры выраслі ў значную культурную сілу.

Д. ОРЛОЎ.
заслужаны артыст БССР.

БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ З БОЛЬШАЙ ЭНЕРГІЯЙ

Фестываль калгасна-соўгасных тэатраў з'явіўся вялікім святам для мастацтва Совецкай Беларусі і ў першую чаргу — для ўдзельнікаў фестываля, работнікаў калгасных тэатраў.

Прызнацца, некаторыя акторы нашых тэатраў ішлі на першы спектакль фестываля з пачуццём, што ўбачаць на сцэне не тое, што бывае ў сапраўдных тэатрах, што ўсё паказанае будзе больш дробным і бледным. І тым мацней была радасць, калі мы ўбачылі поўнакаштоўныя сп[illegible] тэатраў.

11 дзён шэсць маладых калгасна-соўгасных тэатраў БССР дэманстравалі свае дасягненні грамадскасці Менска, літаратарам, працаўнікам мастацтваў. Гарачы прыём аказвалі гледачы спектаклям, таму што гэтыя спектаклі былі сапраўднымі творамі мастацтва. Фестываль калгасна-соўгасных тэатраў паказаў нам, у першую чаргу, наколькі вырасла культура калгасных тэатраў.

Мне асабіста фестываль калгасна-соўгасных тэатраў даў веру і ўпэўненасць у сваіх сілах і ўмацаваў жаданне працаваць з кожным днём лепш.

Г. МЕРКУЛАЎ.
Актор Полацкага калгаснага тэатра.

„ВАССА ЖЭЛЕЗНОВА“

(Слуцкі калгасна-соўгасны тэатр)

Павучальна, што Слуцкі калгасна-соўгасны тэатр паставіў адну з лепшых п'ес М. Горкага — «Вассу Жэлезнову». Багаты драматургічны матэрыял значна ўзняў культурны ўзровень акторажў, навучыў іх глыбока распрацоўваць складаныя вобразы, узброіў калектыў вопытам авалодвання класічнай драматургіяй. Тэатр не саматужнічаў, а запрасіў на пастаноўку вопытнага рэжысёра Ю. Рэшымава, які ставіў гэты-ж спектакль у Рускім драмтэатры БССР.

У прынцыпе мы не прыхільнікі таго, каб пастаноўку, зробленую ў адным тэатры, палкам пераносіць у другі. Але тут трэба ўлічыць, што Ю. Рэшымаў не механічна пераносіць спектакль у Слуцкі тэатр, — ён шмат чаго ў ім змяніў. Ды і малады калектыў, з якім упершыню працуе рэжысёр, прымусіў яго творча падыходзіць да спектакля. Рытмічная няроўнасць спектакля, якая арганічна выцякае з падзей п'есы, чоткасць мізансцэн, кампазіцыйная стройнасць робяць спектакль цэльным і надзвычай цікавым, што трэба паставіць у заслугу рэжысёру. Але там, дзе пастаноўшчык імкнецца навязаць акторам інтанацыі, жэсты і мізансцэны, якія мы ўжо бачылі ў іншым тэатры, яго пасцігае няўдача.

Разбярэм створаныя акторамі вобразы і тады ясна ўбачым адмоўныя і дадатныя якасці работ рэжысёра.

Надзвычай складаны вобраз Вассы Жэлезновай намечан артысткай І. Каменскай у асноўным правільна. Мы хочам спыніцца на тых рысах характару, якія пажадана-б мець у вобразе. Зараз Васса пакуль-што добра зроблена знешне, унутраная-ж глыбіня вобраза яшчэ поўнасцю не раскрыта. Волі гэтага чалавека, самабытнага розуму і тыповых асаблівасцей рускай жанчыны ў вобразе няма. Васса—Каменская больш маці, яна то крычыць, то гаворыць шэптам, то неяк ласкава абыходзіцца з дзецьмі. Чаргаванне гэтых асаблівасцей вобраза іншы раз добра выкарыстоўваецца ў спектаклі. Але там, дзе трэба данесці да гледача класавую нянавісць, дзе трэба паказаць сілу супраціўлення паміраючага класа капіталістаў, актрыса губляецца. Сіла вобраза Вассы і заключаецца ў тым, што гэта—раба свайго класа. Яна бачыць нікчэмнасць сваіх класавых спадарожнікаў, змагаецца з імі, але перад грашыма ўстаяць не можа, і яе пратэст, як голас пустэльніка, глухне ў класавых супярэчнасцях. Актрысе трэба пазбавіцца пазіроўкі, бо гэта не ў духу Вассы. Неабходна больш працаваць над мовай вобраза, каб кожная рэпліка Вассы была арганічнай, трапнай, змястоўнай. Трэба дамагацца тонкасці пераходаў, перажыванняў Вассы, каб сіла гэтага вобраза адчувалася над усім светам ханжаў, лайдакоў, хатніх шпіёнаў. Не трэба Вассе так крычаць пры ўпрошванні мужа прыняць атруту. Наогул, нервовасць не ў характары Вассы. Рэжысёр павінен зразумець, што Васса — не бурклівая жанчына, а што яна ўсёй душой ненавідзіць акружаючых яе прайдох.

Процістаяць Вассе ў п'есе ўсе дзеючыя асобы, за выключэннем толькі Людмілы. Але кожны па-свойму адносіцца да Вассы. Наталья адкрыта пратэстуе супроць усіх звычак дома Жэлезновых. Яна нават падзяляе думкі Рашэлі і сімпатызуе ёй. Артыстка Е. Васілеўская добра адчувае гэту ролю, і пачуцці пратэсту зроблены ёю дасканала. Эпізод з бубнам пастаўлен рэжысёрам добра, актрыса выключна тонка паказвае свае пачуцці праз адносіны да бубна. Выразна паказана нянавісць Наталі да акружаючага асяроддзя, яе абурэнне ім.

На вялікі жаль, артыстка В. Орлова не стварае вобраза рэвалюцыянеркі Рашэлі. Нам здаецца, што тэатру не было неабходнасці запрашаць актрысу эстрады ў такі спаяны і творча афэрмлены калектыў. Трэба проста сказаць, што артыстка Орлова мае рад заштампаваных прыёмаў акторскага выканання, над зжываннем якіх ёй трэба шмат працаваць.

Прохар Храпаў (арт. Н. Пахомаў) няправільна зразумет акторам і рэжысёрам. Гэта не аперэтачны весялун, у якога нага за нагу чапляецца, хоць у маладосці ён і марыў стаць аперэтачным артыстам, але і не проста п'янчужка. Гэта разумны, затоены вораг Вассы, які на яе багацці хоча пабудаваць сваю кар'еру. Ён нават меціць у градаправіцелі. Значыць, Прохар жыве не толькі сёнешнім днём, але думае і аб заўтрашнім. Празмерная камедыйнасць гэтага вобраза выпустошвае яго змест. Актору трэба нанава ствараць вобраз Прахора Храпава.

Людміла пераігрываннем артысткі Л. Всесвяцкай некалькі спрашчаецца. Тут ёсць некаторы налёт штампу. Любоў і прывязанасць к Вассе актрыса слаба даносіць да гледача. Прыцуркаватасць Людмілы падаецца ў некаторых месцах спектакля альбо невыразна, альбо ўтрыравана.

Зусім непрыкметны ў спектаклі вобраз Анны (арт. Н. Варабей). Хатняй шпіёнкі ў вобразе няма, а ёсць хутчэй пляткарка. Зусім адсутнічае затоенае ехідства. Добра зроблена месца ролі, калі Анна бярэ грошы і пхае іх за пазуху, пасля чаго моліцца богу.

Роля Пяцёркіна (арт. В. Каваль) наогул правільна зроблена, але ёсць рад рэжысёрскіх дэталей, якія робяць гэтага нахабніка празмерна смешным. Пры сустрэчы Пяцёркіна з Людмілай не трэба, каб Людміла лезла на стол да Вассы ад таго, што да яе прыстае Пяцёркін. Людміла ніколі не сядзе з нагамі на пісьмовы стол Вассы. Ды, потым, і ўся гэта мізансцэна атрымліваецца нейкай буфанаднай. Не патрэбна, каб Прохар ліў віно на галаву Пяцёркіна ў III акце. Дарэчы, усю сцэну хатняга «канцэрта» трэба яшчэ дапрацаваць, зрабіўшы яе мастацка больш выразнай.

Таксама неабходна дапрацаваць эпізадычныя ролі Лізы (арт. С. Беленева), Полі (арт. Е. Алашэеўская), Еўгенія (арт. А. Арджанаў), зрабіўшы іх больш змястоўнымі і яркімі.

Мастацкае афармленне М. Чарткова не адпавядае спектаклю. Блакітны драпіраваны пакой не характэрны для купецкага дома. Для прыёмнай Вассы, у якую прыходзяць наведвальнікі, трэба было зрабіць больш просты пакой. Грамоздкасць афармлення не дасць магчымасці тэатру паказаць гэты спектакль на калгаснай сцэне.

Мы спыніліся на асноўных, прынцыповых, у большасці адмоўных якасцях спектакля для таго, каб тэатр неадкладна выправіў іх і на доўгі час захаваў спектакль «Васса Жэлезнова» у сваім рэпертуары. Калектыў Слуцкага тэатра — адзін з мацнейшых калектываў нашых калгасна-соўгасных тэатраў, таму яму неабходна ўлічыць і выправіць усе свае недахопы, каб не паўтараць іх у далейшай рабоце.

А. ЕСАКОЎ.

Спектаклі фестываля. «Васса Жэлезнова» А. М. Горкага ў Слуцкім тэатры. Арт. **А. М. Гарэлаў** у ролі Сяргея і арт. **І. М. Каменская** ў ролі Вассы.

Фота І. Капლінскага.

Спектаклі фестываля. «Дура для іншых, разумная для сябе» Лопе дэ-Вега ў Рагачоўскім тэатры. Арт. **Л. І. Мазурэнка** ў ролі Джуліо і арт. **І. Н. Шкалярэнка** ў ролі Дзіаны.

Фота І. Капლінскага.

„ПАРТЫЗАНЫ“

ЗАСЛАЎЛЬСКІ КАЛГАСНА-СОЎГАСНЫ ТЭАТР, ПАСТАНОЎКА П. ДАНІЛАВА.

П'еса Кандрата Крапівы «Партызаны» зусім заслужана заняла пачэснае месца ў рэпертуары нашых тэатраў. Не гледзячы на даволі збітую тэматыку п'есы (грамадзянская вайна, партызанскі рух), драматург пры дапамозе арыгінальных сітуацый стварыў цікавы сюжэт, знайшоў новыя яркія фарбы для паказу чалавечых характараў і страсцей.

27 мая «Партызан» паказаў на фестывалі і Заслаўльскі калгасна-соўгасны тэатр, дзе, дарэчы, гэта п'еса была пастаўлена раней, чым у іншых тэатрах. Малады творчы калектыў тэатра, вырасшага з самадзейнасці, паспяхова справіўся з гэтай складанай п'есай. І пастаноўшчык тав. Данілаў, і акторы правільна данеслі да гледача ідэю, замысел п'есы, раскрылі ў радзе вобразаў складаныя чалавечыя характары, пачуцці, паказаўшы суровую барацьбу беларускага народа супроць сваіх прыгнятальнікаў праўдзіва і сакавіта.

Сярод выканаўцаў у першую чаргу трэба адзначыць актора І. Кунцэвіча. Створаны ім вобраз начальніка партызанскага атрада Данілы Дрыля вылучаецца арыгінальнасцю трактоўкі, свежасцю, тэмпераментнасцю. Толькі часам залішняя крыклівасць і мітуслівасць зніжаюць уражанне. Актору трэба-б было трымаць сябе больш спакойна, упэўнена, больш выразна выявіць і данесці да гледача волевыя якасці камандзіра — начальніка партызанскага атрада, а не выпукляць рысы анархізма. Ад гэтага ўнутраны багаж вобраза толькі выйграў-бы.

Проста і непасрэдна трымае сябе на сцэне актор Ефрэменка, які іграе ролю Батуры. Гэта прастата падкупае гледача.

Рыгор — таварыш Данілы Дрыля — складаны вобраз. Гэта чалавек, які звязан з адным і з другім лагерам і не ведае, куды-ж яму ўрэшце падацца. Вобраз гэты дае вялікія магчымасці для актора. І. Кір'янаў, выканавец ролі Рыгора, не здолеў стварыць яркага, праўдзівага характару. Шмат наіграннасці, меладраматычнай істэрычнасці. Асабліва гэта выразна відаць у сцэне, калі Кацярына падгаварвае Рыгора забіць заснуўшага Данілу. Меладраматызм гэтай сцэны яшчэ больш паглыблен акторскім выкананнем. У выніку атрымаўся нерэалістычны вобраз.

Вельмі аднастайна вядзе сваю ролю арт. Н. Яічка (Настуля). Гэтай вясковай Офеліі нехапае гарачай крыві.

Плакатна выглядае і кулак Маргун у выкананні П. Данілава.

І, нарэшце, зусім слаба іграе М. Тумар пана Яндрыхоўскага: ні голасу, ні жэстаў, ні вонкавага выгляду. Рэжысёр дрэнна зрабіў, што выбраў тав. Тумара для выканання гэтай ролі.

Добрае ўражанне пакідае ігра Ісаевай (пані Яндрыхоўская).

У цэлым спектакль «Партызаны» — удача тэатра. Творчы ансамбль моцны, здольны, а галоўнае — малады. Гэтаму тэатру толькі расці ды расці. А магчымасці ёсць і здольнасці ёсць.

Пажадаем маладому тэатру далейшых удач!

М. БЛІСЦІНАЎ.

СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМІ

29 мая ўдзельнікі фестываля калгасна-соўгасных тэатраў сустрэліся з пісьменнікамі і драматургамі БССР. Сустрэча праходзіла ў атмасферы дружнай, узаемнай крытыкі і паказала гарачае імкненне як работнікаў тэатра, так і пісьменнікаў агульнымі сіламі ўзняць работу калгасна-соўгасных тэатраў на новую вышыню.

Ва ўступным слове старшыня сходу тав. К. Крапіва адзначыў вялікія поспехі калгасна-соўгасных тэатраў. — Калгасна-соўгасныя тэатры, — заявіў ён,—вялікая культурная сіла. І гэта сіла вырасла за апошнія годы толькі дзякуючы велізарным клопатам комуністычнай партыі і совецкага ўрада аб развіцці соцыялістычнага мастацтва.

Папярэднія вынікі фестываля падвёў загадчык тэатральнага сектара Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Юдэлевіч.

Тав. Юдэлевіч падрабязна спыніўся на складзе кожнага тэатра, на яго асаблівасцях, на станоўчых і слабых баках. Работа Заслаўльскага тэатра, напрыклад, сведчыць аб вялікай згуртаванасці, адзінстве ўсяго калектыва. Спектаклі яго характэрны прастатой, шчырасцю, народнасцю. На спектаклях Рагачоўскага тэатра адчуваеш імкненне яго пераймаць вялікія тэатры. І паколькі гэта тэатру не пад сілу, спектаклі яго маюць рад буйных недахопаў.

— Упраўленне па справах мастацтваў,—кажа тав. Юдэлевіч,—вызначыла рад мерапрыемстваў па паляпшэнню работы калгасна-соўгасных тэатраў.

Мастацкі кіраўнік Рагачоўскага тэатра тав. Лізункоў адзначыў вялікую ролю фестываля для далейшага развіцця калгасна-соўгасных тэатраў.

Мастацкі кіраўнік Слуцкага калгасна-соўгаснага тэатра тав. Туроў гаварыў аб тым, што тэатр збіраецца скласці рэпертуарны план на тры годы. Гэта дасць магчымасць максімальна ўдасканаліць лінію тэатра, яго задачы, напрамак.

Народны паэт рэспублікі Якуб Колас указвае на рад недахопаў у пастаноўцы і трактоўцы вобразаў некаторых герояў п'есы «У пушчах Палесся» Рагачоўскім тэатрам.—Фестываль,—кажа тав. Колас,—будзе мець і для тэатраў і для драматургаў вельмі вялікае значэнне. Асноўны шлях для далейшага росту—сістэматычная вучоба. У заключэнне Якуб Колас абяцаў напісаць п'есу для калгасна-соўгасных тэатраў.

Аб сваіх уражаннях ад спектакляў «Васса Жэлезнова», «Партызаны» і «У пушчах Палесся» расказваў тав. Кучар. Ён адзначыў наяўнасць у маладых калектывах раду таленавітых артыстаў, якія ўмеюць ствараць хвалюючыя вобразы, часам больш поўнакроўныя і яркія, чым у некаторых нашых прафесіянальных тэатрах.

Тав. Галаўчынер адзначыў правільную ў асноўным творчую лінію калгасна-соўгасных тэатраў, сур'ёзны, культурны падыход к матэрыялу. Асабліва добрыя спектаклі «Не было ні гроша, ды раптам алтын» у пастаноўцы Бабруйскага тэатра і «Партызаны» у пастаноўцы Заслаўльскага тэатра. Спелым калектывам з'яўляецца і Слуцкі тэатр. Адзін толькі Рагачоўскі тэатр абраў, па думцы тав. Галаўчынера, няправільны шлях. Тэатр сябе пераацэньвае і таму бярэцца за такія складаныя пастаноўкі, як «Егор Булычоў і іншыя» М. Горкага, «Дура для іншых, разумная для сябе» Лопе дэ-Вега. Абедзве гэтыя пастаноўкі аказаліся не па плячу Рагачоўскаму тэатру.

Тт. Масцераў (Полацк) і Каменская (Слуцк), мастацкі кіраўнік Заслаўльскага тэатра тав. Даніла̃ў гаварылі аб неабходнасці стварэння больш спрыяючых умоў для выхавання акторак і падрыхтоўкі новых кваліфіцыраваных кадраў.

З заключнай прамовай выступіў начальнік Упраўлення па справах мастацтваў тав. Озірскі. Ён канстатіраваў, што фестываль прымусіў тэатры падцягнуцца, і што гэты ўздым павінен паслужыць пачаткам яшчэ больш рашучай барацьбы за якасць творчай работы. Тав. Озірскі заклікаў тэатры працаваць, як належыць сапраўдным совецкім калектывам, лепш абслугоўваць калгаснікаў. Партыя і ўрад аддаюць вельмі многа ўвагі рабоце калгасна-соўгасных тэатраў. Адказам на гэтыя клопаты павінна быць стварэнне яшчэ больш высокіх па якасці, сапраўды поўнакроўных і поўнакаштоўных спектакляў.

П.

Н. Шчэглоў

ПУШКІН І ГЛІНКА

I.

Геніяльны рускі паэт А. С. Пушкін — не толькі тварэц новай рускай літаратуры, але і асновапаложнік паэтычнай мовы рускай музыкі. Агульнавядома тая велізарная роля, якую адыгрывала музыка ў жыцці і творчасці вялікага паэта, і тое, як высока ён цаніў яе:

...Из наслаждений жизни
Одной любви музыка уступает,
Но и любовь—мелодия.

У раннім маленстве, калі сястра паэта «беглаю рукою Моцарта ажыўляла»; у ліцэі, дзе захапленне выклікалі «чароўныя гукі»; цудоўныя народныя рускія песні, якія суправаджалі яго жыццё ў Міхайлаўскім і Трыгорскім; матывы народаў Каўказа, Бесарабіі, змякчаўшыя смутак па радзіме, — колькі музычных уражанняў!

Пушкін, дзе-б ён ні знаходзіўся, з захапленнем наведваў канцэрты, хатнія музыцыраванні. Ён добра ведаў Гайдна, Бетховена, Моцарта, Рассіні. Апошнія два —яго любімыя аўтары. У творах Пушкіна мы знаходзім шмат выказванняў аб музыцы і думак, звязаных з успрыманнем музыкі. Тут і «свірэлі гук сумны і просты», «трэнькание балалайкі», «гітары звон», «цыганскія прыпевы», «говар валынкі», і побач — «тоны Пуччыні і Рамо», «чароўны Рассіні». Героі Пушкіна спяваюць, іграюць на інструментах, танцуюць. Музыка «усладжае іх сэрцы», яны гавораць, расказваюць, успамінаюць, думаюць аб ёй. І верш Пушкіна сам па сабе — цудоўная музыка. Усё гэта робіць нашага геніяльнага паэта лепшым музычным паэтам свету. Вось чаму вершы Пушкіна знайшлі такое велізарнае і шматвобразнае адлюстраванне ў музыцы, пачынаючы ад яго сучаснікаў і аж да нашых дзён. Колькі кампазітараў выхоўвалася і выхоўваецца пушкінскай музай! Але першае высокамастацкае і ў большасці неперавышанае ўвасабленне пушкінская паэзія атрымала ў творчасці М. І. Глінкі.

II.

«Геніяльны браток» (па трапнаму выражэнню Стасава), вялікі рускі кампазітар М. І. Глінка быў сучаснікам Пушкіна. Выхаваны, як і Пушкін, на рускай народнай творчасці, ён сваёю геніяльнасцю паклаў пачатак рускай музыцы, быў яе заснавальнікам. Пушкін у літаратуры і Глінка ў музыцы — два гіганты рускай культуры, два выдатных прадстаўнікі вялікага рускага народа. Народнасць Глінкі, як і Пушкіна, не замыкаецца ў вузка нацыянальныя рамкі. Глінка ведае і любіць украінскі, польскі, фінскі, іранскі, грузінскі, арабскі, турэцкі, іспанскі фальклор. Гэты фальклор сустракаецца ў многіх яго творах. Ён, як і яго «геніяльны браток», любіць сваю радзіму, свой народ. Яго творчасць рэалістычная, праўдзівая, шчырая, ідэйная. Абодва яны гавораць простай, зразумелай і разам з тым высокамастацкай мовай. Абодва—стваральнікі мастацкага напрамку.

Пушкін быў на 5 год старэй Глінкі. І калі Глінка яшчэ толькі па-сапраўднаму ўваходзіў у музыку, Пушкін ужо быў спелым мастаком, аўтарам выкрываючых, заклікаючых вершаў («Вольнасць», «Вёска»), настроі якіх ніколі не знікалі ў Пушкіна ў далейшай творчасці, на што не быў здольны Глінка.

Знаёмства Глінкі з Пушкіным пачалося з годаў вучобы кампазітара, які вучыўся разам з братам паэта і сябраваў з ім (у Пецербургскім благародным пансіёне). Пушкін «хадзіваў», па выражэнню Глінкі, у іх пансіён, наведваў брата. Гувернёрам-выхавальнікам Глінкі быў вядомы дзекабрыст Кюхельбекер, прыяцель Пушкіна па ліцэю і паклоннік яго музы.

Увайшоўшы ў свецкае асяроддзе Глінка часта сустракаецца з Пушкіным — не толькі як знаёмы, але і як блізкі [illegible] творца.

Сустрэчы адбываюцца ў Жукоўскага, у прыяцеля і таварыша Пушкіна—Дэльвіга, у сястры Пушкіна—Паўлішчэвай, у доме нявесты Пушкіна, у Керн і ў іншых. У «сямейнай хроніцы» сын Паўлішчэвай апісвае адну з такіх сустрэч. Глінка ў прысутнасці паэта выканаў свой новы раманс на яго словы: «Я помню дзіўнае імгненне...». «Бацька (муж Паўлішчэвай, кампазітар-аматар і прыяцель Глінкі), — піша Паўлішчэў, — акампаніраваў спеваку на сямiструннай гітары. Дзядзя (сам Пушкін) кінуўся абдымаць абодвух выканаўцаў».

Выкананне Глінкі, якое часта слухаў Пушкін, заўсёды выклікала яго пахвалу. Паэт адносіўся да кампазітара з сімпатыяй і радасцю. Аднойчы Глінка атрымаў ад Грыбаедава тэму грузінскай песні. Пушкін напісаў на гэты матыў свой вядомы верш «Не пой, красавіца, пры мне». Глінка зараз-жа пераклаў яго на музыку і выканаў у прысутнасці Пушкіна.

Пасля пастаноўкі першай оперы Глінкі «Іван Сусанін» прыяцелі ўшаноўвалі кампазітара. Пушкін, Жукоўскі, Вяземскі напісалі экспромты, куплеты. Вось куплет Пушкіна:

Слушая сию новинку,
Зависть, злобой омрачась,
Пусть скрежещет, но уж Глинку
Затоптать не может в грязь.

Творчае сутыкненне натуральна нараджае ў Глінкі імкненне да больш глыбокай сувязі з Пушкіным. Глінка песціць думку зрабіць з захапіўшай яго паэмы паэта «Руслан і Людміла» другую сваю оперу. Пушкін зацікавіўся гэтай думкай, хоча сам стварыць лібрэта, але трагічная смерць паэта пакідае намер абодвух мастакоў неажыццёўленым.

Каля паўтара года Глінка не мог знайсці лібрэта, а калі знайшоў (аўтар—нейкі Бахтурын), усклікнуў: «Бахтурын замест Пушкіна! Як гэта здарылася?—сам не разумею!». Пасля смерці Пушкіна Глінка не раз звяртаўся да яго выдатных вершаў. У оперы «Руслан і Людміла» на тэксты Пушкіна Глінкам напісаны: арыя Руслана — «О, поле, поле!», балада Фінна — «Любезны сын», персідскі хор «Кладзецца ў поле...». У рамансах Глінкі знайшлі ўвасабленне: «Іграй, Адэль», «У крыві гарыць», «Дзе наша роза», «Кубак янтарны», «Начны зефір», «П'ю за здароўе Мэры», «Я тут, Інезілля», прызнанне «Я вас люблю».

Глінкаўская пявучая, чаканная мелодыя, простае і глыбокае суправаджэнне выключна поўна і ярка даносіць пушкінскі верш, усе яго адценні і настроі. Калі асабістыя сутыкненні паміж двума мастакамі не сталі глыбокімі, абмежаваўшыся знешнімі сувязямі, то раскрыццё Глінкам Пушкіна ў сваёй творчасці з'яўляецца намёкам, што сувязі гэтыя трэба шукаць у іх вельмі блізкіх установках, у іх геніяльнасці, што зрабіла іх — аднаго асновапаложнікам новай рускай літаратуры, другога — асновапаложнікам рускай музыкі.

III.

Глінка пераўжыў Пушкіна на 20 год. Але жыццё іх, трагічная смерць аднаго і амаль забытая канчына другога — аднолькавы вынік гнілога, крывадушнага, бяздушнага, прадажнага, угодніцкага рэжыму нікалаеўскай Расіі, рэжыму, які зацкаваў лепшых людзей краіны. Пушкіна, «уславіўшага ў свой жорсткі век свабоду», гналі, праследвалі і, нарэшце, забілі. Глінка, тварэц «Сусаніна» і «Руслана», мог тварыць толькі за межамі радзімы — той «гнуснай», па яго выражэнню, краіны, якую ён жадаў «больш ніколі не бачыць», дзе ў яго «здолелі адабраць усё, нават энтузіязм да мастацтва», яго «апошні прытулак». Калі «мужыцкая» мова Пушкіна выклікала абурэнне, то і «фурманская музыка» была не менш пагарджальнай ацэнкай творчасці Глінкі. Гэтыя пагарджальныя эпітэты, якімі арыстакратыя і царскі двор узнагароджвалі Пушкіна і Глінку, надзвычай паказальны. Яны даваліся тым, хто ўпершыню глыбока ацаніў рускую народную творчасць, сур'ёзна вывучыў яе, узняў яе на велізарную мастацкую вышыню, зрабіў яе неацанімым здабыткам сусветнай культуры. Наша вялікая совецкая радзіма ведае і любіць Пушкіна і Глінку. Іх імёны захоўваюцца ў сэрцы кожнага працоўнага, іх творчасць жыве з намі. Яны заўсёды з намі, заўсёды нашы.

ХРОНІКА ФЕСТЫВАЛЯ

За час фестываля з удзельнікамі яго праведзена вялікая масавая работа. Рэжысёр Тэатра оперы і балета т. Тамарын прачытаў дзве лекцыі аб майстэрстве актора. Рэжысёр Яўрэйскага тэатра тав. Галаўчынер прачытаў лекцыю на тэму «Работа актора над сабой». Лекцыю «Як працаваць над роляю» прачытаў заслужаны артыст рэспублікі — рэжысёр Рускага тэатра БССР тав. Орлоў. Дзве лекцыі аб гісторыі беларускай драматургіі і беларускага тэатра прачытаў тав. Модэль.

Кожныя два дні адбываліся адкрытыя пасяджэнні журы, на якіх дэтальна разбіраліся пастаноўкі тэатраў і работа акторыаў. Было арганізавана некалькі экскурсій у Музей рэвалюцыі. Удзельнікі фестываля атрымалі шырокую магчымасць азнаёміцца з пастаноўкамі Тэатра оперы і балета, Рускага драмтэатра БССР і Тэатра музкамедыі БССР.

**

У часе фестываля Лепельскі калгасна-соўгасны тэатр даў два канцэрты Менскаму гарнізону. 30 мая Полацкі тэатр паказаў пагранічнікам «Генконсул».

Два спектаклі далі тэатры для стаханаўцаў фабрык імя Кагановіча і «Октябр», завода «Большэвік», імя Кірава, «Ударнік» і інш.

Усяго калгасна-соўгасныя тэатры за час фестываля далі 15 спектакляў і канцэртаў і абслужылі каля 10.000 чалавек.

31 мая адбыўся агульны сход удзельнікаў фестываля сумесна з членамі журы, на якім былі падведзены вынікі фестываля.

Журы адзначыла добрую работу Заслаўльскага, Слуцкага і Бабруйскага тэатраў і параіла ім прадоўжыць соцыялістычнае спаборніцтва, у выніку якога можна будзе вырашыць пытанне аб пасылцы таго ці іншага тэатра ў Маскву на Ўсесаюзны фестываль калгасна-соўгасных тэатраў.

**

Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР прэміраваны Заслаўльскі, Слуцкі і Бабруйскі калгасна-соўгасныя тэатры па 1500 руб. кожны. Прэміраваны лепшыя работнікі калгасна-соўгасных тэатраў тт. Даніла̃ў, Шыф, Кунцэвіч, Шыкавец, Кір'янаў, Ефрэменка (Заслаўльскі тэатр), Легоцін, Груздз, Гуняжэнка, Латоцкая, Оўштэйн (Бабруйскі тэатр), Каменская, Варабей, Марцьянава (Слуцкі тэатр), Свірчэўскі, Касая, Леонаў, Калінаў (Рагачоўскі тэатр), Галеркін, Масцераў, Азаркоў (Полацкі тэатр).

Абвешчана падзяка рэжысёрам калгасных тэатраў тт. Рэшымаву і Каваліну, мастаку тав. Чарткову.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Т—1301.